Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 281 (5114)
СНЕЖНЯ
16
НЯДЗЕЛЯ
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Тав. ЖДАНАЎ ВЫБРАН ПЕРШЫМ САКРАТАРОМ ЛЕНІНГРАДСКАГА АБКОМА ВКП(б)

ЛЕНІНГРАД, 15 снежня. (БЕЛТА). Сёння у палацы Урыцкага адбыўся многалюдны сход актыва ленінградскай партыйнай арганізацыі. З'яўленне за сталом прэзідыума сакратара ЦК ВКП(б) тав. **Жданава** ленінградскімі большэвікамі сустракаецца бурнай авацыяй.

Па прапанове сакратара абкома ВКП(б) т. **Чудава** сход ушанаваў уставаннем памяць тав. С. М. Кірава, загінуўшага ад здрадніцкай рукі класавага ворага.

Ва уступным слове т. Чудаў паведаміў, што на толькі што закончыўшымся аб'яднаным пленуме ленінградскага абласнога і гарадскога камітэтаў ВКП(б) першым сакратаром абласнога і гарадскога камітэтаў аднагалосна выбран сакратар ЦК ВКП(б) тав. **А. А. Жданаў.**

Многатысячны сход устае і наладжвае т. Жданаву бурную доўгую авацыю.

Тав. Жданаў выступіў з дакладам аб выніках лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б).

ВЫКАНАЦЬ У ТЭРМІН РАМОНТ ТРАКТАРОУ

Пры вызначэнні плана асенне-зімовага рамонту трактарнага парку партыяй і ўрадам было ўказана, што 50 процантаў праграмы неабходна выканаць ужо ў IV квартале бягучага года. Сэнс гэтага рашэння быў у тым, каб пазбегнуць вясной рамонтнай гарачкі, якая назіралася ў мінулыя гады.

Што зроблена за гэты час?

Вельмі і вельмі мала. План рамонту трактароў па БССР выкананы усяго на 16 проц. Замест 100 проц. трактароў, падлягаючых рамонту ў IV квартале, адрамантавана толькі 57 проц. Па большасці МТС рамонт па сутнасці не пачалі. Паўтараецца мінулы год, калі ўвесь цяжар работ падаў на прадвеснавыя месяцы. Праграма падрыхтоўкі трактарнага парка, прадугледжваўшая раўнамерную нагрузку майстэрань на працягу шасці месяцаў, сарвана. Вось да чаго прывяла нераспарадчасць і бестурботнасць зямельных органаў і кіраўнікоў многіх МТС і майстэрань.

Дагэтуль 28 МТС БССР зусім не пачыналі рамонту. Нават тыя майстэрні, якія прынялі першую партыю трактароў, усё яшчэ «раскачваюцца», заняты больш ліквідацыяй розных непаладак, чым рамонтам.

Што-ж перашкаджае рамонту, што стрымлівае тэмпы?

Першае і галоўнае — гэта арганізацыя працы ў майстэрнях. Практыка мінулых год паказала, што своечасовы і добраякасны рамонт быў праведзен там, дзе правільна арганізавалі працу ў майстэрнях, нападзілі самы працэс вытворчасці, дзе быў дасканалы план даведзен да кожнай рамонтнай брыгады, кожнага спецара, токара і трактарыста.

Аднак, многія нават старыя майстэрні не ўлічылі гэтых агульна-вядомых ісцін. Найбольш яркім прыкладам безадказных адносін да арганізацыі рамонту можа паслужыць ГОМЕЛЬСКАЯ МТМ (дырэктар СУВОРАЎ). У лістападзе трэба было адрамантаваць 23 маторы і 7 трактароў. Гэта задание нават на 10 снежня не выканана; адрамантавана толькі 19 матораў і 7 трактараў. Гомельская майстэрня працуе ўжо трэці год, добра абсталявана і забяспечана кадрамі рабочых, мае дастатковую колькасць запасных частак. І ўсё-ж рамонт сарваны выключна таму, што работа ў самой майстэрні, у яе цэхах зусім не наладжана. План рамонту да паасобных брыгад на працягу двух месяцаў не быў даведзен. Рабочыя цэлымі гадзінамі прастойвалі толькі таму, што нз ведалі, што ім рабіць. Ведамасці на рамонт складаліся настолькі нядбайна, што годныя часткі выбракоўваліся, а нягодныя пакідаліся. Гэта, зразумела, затрымлівала работу, зрывала рамонт. Дырэктар на працягу кастрычніка спасылаўся на адсутнасць запасных частак як на прычыну зрыву рамонту. У той-жа час патрэбныя запасныя часткі ляжалі на яго-ж складзе.

Прыведзеныя факты гавораць толькі аб нежаданні ўвайсці ў дэталі даручанай справы, сапраўды адказваць за сваю работу.

Аналагічны малюнак і ў радзе іншых старых МТМ, як ПОЛАЦКАЯ і ЛЕПЕЛЬСКАЯ. У Лепелі, напрыклад, кіраўніцтва майстэрні дагэтуль не здолела роўнамерна расставіць людзей на ўсіх працэсах. У выніку на шліфоўцы дэталей не хапае рабочых, а на зборцы матораў людзі прастойваюць гадзінамі.

Вывад ясны. Паспяховае правядзенне рамонту патрабуе перш за ўсё чоткага прадуманага плана работы, даведзенага да кожнай брыгады, да кожнага рабочага. Штодзённыя заданні брыгадам, роўнамерная нагрузка людзей, своечасовая падрыхтоўка дэталей, штодзённы кантроль за выкананнем заданняў — вось асноўныя ўмовы, якія забяспечаць паспяховы і своечасовы рамонт трактароў.

Наступная прычына, якая тармозіць рамонт, гэта нібыта адсутнасць сродкаў. Многія МТС месяцамі не выкупляюць запасных частак, спасылаючыся на адсутнасць грошай. Ці маюць падставы гэтыя спасылкі? — Ні ў якім разе. Зусім нецярпіма пазіцыя тых кіраўнікоў МТС, якія самі ствараюць дадатковыя труднасці ў рамонце. Сродкі, адпускаемыя на амартызацыю і рамонт, многія кіраўнікі МТС (Менск, Рэчыца і інш.) расходуюць не па прызначэнню — на пакрыццё перарасходаў па гаручаму, па зарплаце, па будаўніцтву. Якое апраўданне, напрыклад, могуць прадставіць дырэктары Большэвіцкай МТС (Квятняк) і Рэчыцкай (Паўлаў), што яны на працягу двух месяцаў не выкупляілі запасных частак пад прадлогам адсутнасці сродкаў і сарвалі рамонт. Толькі калі пытанне было пастаўлена рубам, сродкі знайшліся.

І, нарэшце, нельга абыйсці пытання ЯКАСЦІ рамонту. З раду майстэрань ужо сігналізуюць аб дрэнай якасці адрамантаваных матораў. У Гомельскай МТМ, напрыклад, гэтымі днямі прышлося забракаваць 7 матораў выключна з прычыны нядбайнасці механіка і бракаўшчыка. Чатыры маторы Бяляніцкай МТС, адрамантаваныя ў Аршанскай майстэрні (дырэктар Матус), таксама аказаліся непрыгоднымі.

Дырэктары МТС і МТМ і старшыня механікі павінны цвёрда памятаць, што яны персанальна адказваюць за якасць рамонту. За кожны недоброякасна адрамантаваны трактар яны будуць прыцягвацца да найстражэйшай адказнасці.

Далейшае зацягванне рамонту можа стварыць непасрэдную пагрозу для посеву ўсёй зімовай рамонтнай кампаніі. У бліжэйшыя-ж дні пагалоўна ўсе майстэрні БССР павінны ўключыцца ў рамонт і ўзяць большэвіцкі разгон у рабоце з такім разлікам, каб пакрыць сваю запазычанасць за кастрычнік і лістапад.

ЗА БОЛЬШЭВІЦКУЮ РЭАЛІЗАЦЫЮ РАШЭННЯЎ ПАРТЫІ

Сёння мы друкуем матэрыялы аб тым, як на мясцах рыхтуюцца да свабоднага продажу хлеба.

Паступаючыя сігналы з месц выклікаюць сур'ёзную трывогу. Ва многіх раёнах (Бабруйск, Полацк, Бешанковічы і інш.) не ўзяліся па-большэвіцку за ажыццяўленне рашэнняў пленума. Падрыхтоўка гандлёвых памяшканняў ідзе зусім дрэнна. Некаторыя раёны абмяжоўваюцца тым, што выносяць безліч рэзалюцый накшталт «наладзіць», «разгарнуць», «арганізаваць» і т. д. Гэтыя вічога не гаворачыя рэзалюцыі застаюцца нікчэмным кавалачкам паперы, а за імі вельмі часта хаваецца бяздзейнасць.

На што зараз неабходна звярнуць выключную ўвагу?

Па-першае, разгарнуць заразжа падрыхтоўку гандлёвых памяшканняў у гарадах і раёнах. Не намячаць «пункта», а падрыхтаваць прасторныя, утульныя магазіны, устанавіўшы ў іх поўны санітарна-гігіенічныя ўмовы. Падрыхтаваць кадры прадаўцоў, загатоўшчыкаў магазінаў і т. д.

Па-другое, глыбока прапрацаваць пытанне з кадрамі хлебапёкаў. Гэта асабліва важна ў раёнах, дзе няма дастатковай колькасці кваліфікаваных рабочых. Профсаюзы і гаспадарчыя арганізацыі павінны прадумаць гэта пытанне з тым, каб забяспечыць раёны высокакваліфікаванымі кадрамі.

Па-трэцяе, вытворчая база. Зараз-жа ў раёнах цвёрда ўстанавіць сетку пякарань, дакладна разлічыць іх вытворчую магутнасць. Неадкладна ўзяцца за капітальную перабудову і расшырэнне ўжо наяўных пякарань з такім разлікам, каб яны поўнасцю як па колькасці, так і па якасці хлеба задавальнялі попыт насельніцтва.

Па-чацвертае, Народны камісарыят унутранага гандлю і профсаюзныя арганізацыі неадкладна павінны прадумаць рад мерапрыемстваў, звязаных з наладжваннем продажу хлеба, асабліва ў соўгасах і леспрамгасах. Трэба мець на ўвазе, што там сканцэнтравана значная маса рабочых. Вытворчая база і гандлёвыя памяшканні не прыстасаваны да свабоднага продажу хлеба. І калі гэта ўпусціць зараз, то мы можам сутыкнуцца з парушэннем нармальнага гандлю хлебам. Гэта ў значнай ступені адносіцца і да транспартных арганізацый. Наркомунтрандаль і Белкаапсаюз абавязаны па кожнаму гораду і раёну праверыць мяркуемы асартымент хлебных вырабаў і вытворчую магутнасць заводаў і пякарань з тым, каб у бліжэйшыя дні зрабіць рад рашучых мер, забяспечваючых выкананне рашэнняў пленума.

Сакратары РК партыі і старшыні райвыканкомаў абавязаны асабіста правяраць як ідзе падрыхтоўка да свабоднага продажу хлеба. Кожны дзень трэба аператыўна кіраваць і дапамагаць органам Наркомунтранглю і спажыўкааперацыі ў выкананні гэтага важнейшага мерапрыемства партыі і ўрада.

Насустрач новаму гаспадарчаму году

РАСЦЕ КАЛОНА ПЕРАДАВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ

15 снежня выканаў гадавы промфінплан Менскі машынабудаўнічы завод імя Кірава (б. «Комунэр») (Дырэктар завода тав. **Драбышэўскі**, сакратар парткома тав. **Гураліс**, старшыня заўкома тав. **Гальперын**).

Калектыў завода абавязваецца да канца года даць звыш плана прадукцыі на 200.000 руб.

***

14 снежня выканаў гадавы промфінплан асіпавіцкі шкіпазавод «Окцябр». (Дырэктар тав. **Гольдовіч**, сакратар парткома тав. **Гоынь**, старшыня заўкома тав. **Гальперын**).

За рубяжом

РОСТ ПАЎСТАНЦКАГА РУХУ Ў МАНЧЖУРЫІ

ШАНХАЙ, 14 снежня. (БЕЛТА). Згодна вестак «Шуньбао», толькі ў адной Мукденскай правінцыі ў лістападзе партызаны арыбілі 662 напады на японскія войскі, г. зн. на 328 нападаў больш, чым у кастрычніку. Колькасць партызан дасягнула 95 тыс. чалавек — на 38 тыс. больш, чым у кастрычніку. 9 чыгуначных станцый захвачаны партызанамі.

Японцы — прадажная газета — правялі новую кампанію па разбурэнню насельніцтва Мукдэна.

Урад правінцыі Жэхэ таксама выдаў загад аб канфіскацыі зброі ў прыватных асоб, пагражаючы, што парушальнікі загада будуць разглядацца як бандыты.

Згодна паведамлення той-жа газеты партызаны на днях акружылі і разгромілі два японскія атрады ў раёне Даймакоу і Хуачуань ва Ўсходняй частцы правінцыі Гірын.

Як паведамляе газета «Дзеньбао», на днях японцы пачалі новую карную экспедыцыю супроць партызан у Паўночнай частцы правінцыі Гірын. Адначасова ўзрасла актыўнасць партызан у Хейдун-цзянскай (Цыцыкарскай) правінцыі з мэтай перашкодзіць японцам сканцэнтраваць свае сілы ў Гірынскай правінцыі.

«Чайна таймс» паведамляе, што партызаны атакавалі і абязброілі японскую часць недалёка ад Бэйцзяна ў раёне Харбіна. Прадаўжаюцца баі ў раёне Шылайкоу ва Ўсходняй частцы правінцыі Гірын.

***

ШАНХАЙ, 12 снежня. (БЕЛТА). Згодна вестак з Харбіна, 5 снежня ў лесе за 7 кілометраў на паўднёвы ўсход ад станцыі Шуйцюйлю на Лафа-Харбінскай чыгунцы главары буйных «шаяк» Тай-лін, Ся-о, Тай-цін і інш., разам з атрадамі ў колькасці некалькіх сот чалавек наладзілі сакрэтную нараду. Нарада пастанавіла прадаўжаць аказваць упартае супраціўленне японскім уладным войскам і ў выпадку захвату японскіх салдат і шпіёнаў неадкладна іх расстрэльваць.

АНТЫЯПОНСКІЯ ЛІСТОЎКІ НА ВУЛІЦАХ МУКДЭНА

ШАНХАЙ, 12 снежня. (БЕЛТА). З Харбіна паведамляюць, што 5 снежня ў Мукдене на галоўнай вуліцы з'явіліся лістоўкі антыяпонскага і антыманчжурскага характару. Для таго каб злавіць асоб, распаўсюджваўшых лістоўкі, у горадзе расстаўлены паліцэйскія атрады. Ва ўсіх рэстаранах, гасцініцах, друкарнях зроблены вобыскі.

АДМАЎЛЕННЕ АД ПЛАЦЯЖОЎ ПА ВАЕННАМУ ДОЎГУ

ВАШЫНГТОН, 14 снежня. (БЕЛТА). Міністэрствам замежных спраў ЗША атрыманы ад Францыі, Італіі, Польшчы, Бельгіі і Чэхаславакіі ноты, якія паведамляюць аб адмаўленні плацяжоў па ваеннаму доўгу, тэрмін якіх наступае 15 снежня. Англія паведаміла ўжо раней аб адмаўленні ад плацяжу. Зробіць плацеж толькі Фінляндыя.

ФАШЫСЦКАМУ ТЭРОРУ НЕ ЗЛАМАЦЬ РЭВОЛЮЦЫЙНАГА РУХУ Ў ГЕРМАНІІ

БЕРЛІН, 14 снежня. (БЕЛТА). Учора ўрадам зацверджаны 18 законаў, якія датычаць розных галін палітыкі, эканомікі, права і культуры.

Законам «супроць злосных нападаў на дзяржаву і партыю» прадугледжваюцца драконаўскія меры барацьбы з самымі нязначнымі выступленнямі супроць урада і нацыянал-сацыялістскага руху. Цэнтральны артыкул закона прадастаўляе судам права пасылаць на пажыццёвую катаргу, а ў «асабліва цяжкіх выпадках» і на кару смерці «ўсякага, хто чыніць дзеянні з памерам выклікаць хваляванні і ўзбудзіць страх сярод насельніцтва, або стварыць знешне-палітычныя затрудненні для Германіі».

***

БЕРЛІН, 14 снежня. (БЕЛТА). Сярод прынятых учора новых законаў знаходзіцца таксама асобы закон «аб падтрымаанні парадку і дысцыпліны ў лагерах добраахвотнай працоўнай павіннасці».

Упраўленне і кіраўніцтва гэтымі лагерамі пераходзіць з ведання міністэрства працы ў ведание міністэрства ўнутраных спраў. Уводзіцца дысцыпліна накшталт ваеннай. Начальнікам лагераў, паміма звычайных пакаранняў, прадастаўляецца права арышту. Апрача таго, выданы два законы аб дробным гандлі і аб адвакатуры. Гэтыя законы прадастаўляюць сабой чарговую уступку патрабаванням сярадніх слаёў.

Закон аб гандлі прадугледжвае бестэрміновую забарону адкрыцця новых крам. Адвакатура будзе з гэтага часу прадастаўляцца толькі пасля праверкі «палітычнай надзейнасці» кандыдата. Дазволы на адвакацкую практыку могуць быць адабраны.

ПРАЦЭС ГЕРМАНСКІХ ФАШЫСТАЎ У ЛІТВЕ

БЕРЛІН, 14 снежня. (Інфармацыя «Правды»). Сёння раніцою ў Каўнасе (Коўна) у вялікай зале міністэрства юстыцыі пачаўся працэс 126 мемельскіх нацыянал-сацыялістаў па абвінавачанню ў падрыхтоўцы ўзброенага бунту. Справа разбіраецца ў літоўскім вярхоўным ваенным судзе пад старшынствам палкоўніка Леонаса.

Зала суда прадстаўляе цікавае відовішча. У якасці рэчавых доказаў выстаўлена вялікая колькасць скрынь са зброяй, знойдзенай у абвінавачаных зброяй германскага ўзору.

Матэрыял паперэднага следства сабран у 33 тоўстых томах, выстаўленых на спецыяльных паліцах ззаду судовага стала. У зале прысутнічае некалькі дзесяткаў прадстаўнікоў замежнага друку. Для публікі адведзена каля 100 месц. Сёння раніцою пачалося чытанне абвінаваўчага акта.

ГЕРМАНСКІЯ ЗАІГРЫВАННІ Ў ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ, 14 снежня. (Інфармацыя «Правды»). Германскія нацыянал-сацыялісты прадаўжаюць, не гледзячы на дыпламатычныя паражэнні, шукаць прыхільнасці Парыжа.

«Пці журналь» публікуе сёння надзвычай характэрнае з гэтага пункту гледжання інтэрв'ю фон-Папена, якое ён даў вядомаму журналісту і пісьменніку Жорку Сюарэ.

Папен прабуе знайсці з нацыянал-сацыялістскага кіраўніцтва адказнасць за забойства Дольфуса, ускладаючы віну на «дынамічнасць нацыянал-сацыялістскага руху».

Затым ён зрабіў наступную заяву па поваду франка-германскіх адносін: «Я цвёрда пераконан у неабходнасці супрацоўніцтва паміж Францыяй і Германіяй. Абедзве краіны павінны дагаварыцца паміж сабой. Інакш Еўропа і ўвесь свет узарвуцца». Папен запэўніў Сюарэ, што калі рэзультат саарскага галасавання будзе спрыяльны для Германіі, апошняя не будзе прымяняць рэзкіх мер. І «раз пытанне аб Саары будзе вырашана, Францыя і Германія павінны будуць песна супрацоўнічаць адна з другой, калі яны хочуць жыць».

ТОЛЬКІ РЭВОЛЮЦЫЯ ВЫЗВАЛІЦЬ ПРЫГНЕЧАНЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦІ

НЬЮ-ЮРК, 13 снежня. (БЕЛТА). Адбыўся склканы «Ікор» («таварыства садзейнасці каланізацыі яўрэяў у СССР») мітынг, прысвечаны першаму з'езду советаў у Яўрэйскай аўтаномнай вобласці Біробіджан. Прысутнічала 8 тыс. рабочых і відныя прадстаўнікі яўрэйскай інтэлігенцыі, у тым ліку пісьменнікі Брайнін, Гіршбейн, прафесар Альфонс Гольдшмідт. Атрымана многа прывітанняў, у тым ліку ад Уорда — старшыні амерыканскай Ліг. барацьбы з ваеннай небяспекай і фашызмам.

Рэдактар комуністычнай газеты «Фрэйхейт» Ольгін заявіў, што стварэнне Яўрэйскай аўтаномнай вобласці ў Біробіджане з'яўляецца лагічным вынікам ленінскага вырашэння нацыянальнага пытання. Паводле слоў Ольгіна, гэты факт з'яўляецца гістарычнай надзеяй. У Амерыцы, дзе назіраецца рост антысемітызма, яўрэйскія масы разумеюць, што толькі рэвалюцыя можа вырашыць праблемы, звязаныя з прыгнечанымі нацыянальнасцямі, у тым ліку яўрэйскае і негрыцянскае пытанні. «Біробіджан, — заключыў Ольгін, — гэта перамога компартыі Совецкага Саюза, якая пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна вызваліла ўсе прыгнечаныя народы — ахвяры царызма».

„ГЕРМАНСКІ ФРОНТ" НА НОВЫХ ПАЗІЦЫЯХ

У сувязі з хуткім прыбыццём у Саар міжнародных войск радзеюць рады прыхільнікаў «германскага фронта» ў той час, як мітынгі праціўнікаў Германіі паражаюць многалюдствам і энтузіязмам.

(З газет).

Мал. Нік. ЛЕЎШЫНА.



СЯЛЯНСКІ УРАД У РАЁНЕ РЭАЛЕНГО НА КУБЕ

НЬЮ-ЮРК, 6 снежня. (БЕЛТА). Карэспандэнт гаванскай газеты **«Аора»**, які пабываў у раёне Рэаленго (Куба), прыводзіць рад цікавых вестак аб становішчы, што стварылася ў гэтым раёне. Тут мясцовыя сяляне, паводле слоў карэспандэнта, стварылі свой уласны ўрад, які выбіраецца ўсімі штогод. Сяляне Рэаленго выпусцілі рад маніфестаў. У прыватнасці адзін з іх, адрасаваны **«да сялян Кубы, да ўсіх рабочых арганізацый, салдат і маракоў, да ўсіх прыгнечаных»**, заклікае працоўныя масы Кубы падтрымаць іх барацьбу за зямлю, абяцаючы сваю дапамогу ў агульнай барацьбе рабочага класа супроць наступлення капітала.

Як паведамляюць, сялянскі ўрад у Рэаленго намерен выпусціць уласную газету, запрасіць большую колькасць настаўнікаў для навучання дзяцей і прадпрыняць будаўніцтва дарог у гарыстых раёнах Рэаленго. Кіраўніком сялянскага руху ў Рэаленго і главой яго цяперашняга ўрада з'яўляецца **негр Ліно Альварэс**, вядомы сваім удзелам у рэвалюцыйным руху.

Пад націскам грамадскай думкі ўрад, не гледзячы на сваё катэгарычнае заўвежанне аб тым, што ён выганіць сялян Рэаленго з зямлі, вымушан быў адступіць і апублікаваць заўвежанне, што ён не прадпрыме ніякіх крокаў для высялення сялян па меншай меры на працягу года. Замежныя кампаніі, зацікаўленыя ў цукровай прамысловасці Кубы, неаднаразова рабілі спробы захапіць землі ў раёне Рэаленго, якія выкнатаюцца асабліва ўраджайнасцю, аднак атрымлівалі рашучы адпор з боку сялян.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

Учора увечары **спецыяльны поезд, у якім Гітлер варочаўся з Брэмена** пасля агляду недаўна спушчанага браненосца «Адмірал Шэер», наскочыў на пераезджаўшы чыгуначную лінію **зўтабус.** Аўтабус разбіт ушчэнт. З 20 чалавек, бывшых у ім, 13 забіты, двое памерлі ў больніцы, астатнія атрымалі цяжкія раненні. Поезд і яго пасажыры не пастрадалі.

Згодна паведамлення з Сафіі, ваенны суд у Старой Загоры разглядзеў справу 40 асоб, якія абвінавачваліся ў комуністычнай дзейнасці ў балгарскай арміі. 25 прыгаворэны к **катаржнай турме** на тэрміны ад 1 да 12 год.

У Парыжы пачалося святкаванне тысячагоддзя з дня нараджэння персідскага паэта Фердоусі. На святкаванне прыбылі спецыяльныя прадстаўнікі персідскага ўрада і французскі пасланнік у Тэгеране.

14 снежня ў Рыгу прыбыў начальнік штаба літоўскай армії палкоўнік **Раштыніс.** У гутарцы з прадстаўнікамі друку Раштыніс заявіў, што мета яго афіцыяльнага візіту — азнаямленне з латвійскай арміяй і ўмацаванне з ёй сувязі.

По Совецкаму Саюзу

9 снежня ў народным камісарыяце замежнага гандлю тав. А. **Розенгольцам** і французскім міністрам гандлю п. **Полем Маршандо** падпісан французска-совецкі пратакол па пытаннях гандлю.

На здымку: справа на лева: тав. Розенгольц, п. Поль Маршандо і французскі пасол у СССР п. Альфан пасля падпісання пратакола.

ПОЕЗД „РУХОМЫ ДОМ ТЭХНІКІ"

МАСКВА, 14 снежня. (БЕЛТА). Гэтымі днямі на магістраль Масква—Данбас выязджае спецыяльны поезд «Подвижной дом техники», арганізаваны НКШЗ. Ён складаецца з 5 вагонаў, дзе сканцэнтравана розныя экспанаты, мадэлі, чарцяжы, плакаты і т. д. Поезд суправаджаюць відныя спецыялісты чыгуначнікі. Задача поезда — арганізаваць тэхнічнай вучобы чыгуначнікаў.

РАБОЧА-КАЛГАСНЫ УНІВЕРСІТЭТ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

ТУЛА, 13 снежня. (БЕЛТА). У Шчэкіне адбылося ўрачыстае адкрыццё рабоча-калгаснага універсітэта музычнай культуры, арганізаванага па ініцыятыве палітаддзела МТС і райкома партыі. Зімой універсітэт падрыхтуе дзесяткі кіраўнікоў для хораў і аркестраў для шахт і калгасаў раёна. Ва універсітэт запісалася 300 пярэдкоў і калгаснікаў. Заняткамі будуць кіраваць выкладчыкі маскоўскай кансерваторыі.

15-годдзе РАЗГРОМА КАЛЧАКА

НОВАСІБІРСК, 14 снежня. (БЕЛТА). На ўсіх прадпрыемствах і ва ўстановах праходзяць мітынгі, прысвечаныя 15-годдзю разгрому Калчака. Святкаванне гадавіны намечана на 23 снежня.

***

НЕЗАМЕТНЫ, 14 снежня. (БЕЛТА). 15 снежня спаўняецца 15-годдзе разгрому Калчака і ўстанаўлення ў Якуціі совецкай улады. У сувязі з гэтым у Алдане — у горадзе і на прыісках — арганізуюцца ўрачыстыя вечары ўспамінаў удзельнікаў разгрому калчакоўшчыны.

ВЫКАНАНА 80 ПРОЦ. ПЛАНА ЗАГАТОВАК ІЛЬНОВАЛАКНА

МАСКВА, 14 снежня. (БЕЛТА). К 10 снежня гадавы план загатовак ільновалакна выкананы па Саюзу на 80,7 проц. Датэрмінова выканала план Маскоўская вобласць. Напярэдадні выканання задання Івана-ўская і Ленінградская вобласці і БССР.

АДРАМАНТАВАНА 23 ТЫСЯЧЫ ТРАКТАРОЎ

МАСКВА, 15 снежня. (БЕЛТА). Па Саюзу на 10 снежня адрамантавана 23.149 трактароў. МТС і соўгасы Наркамзема СССР прывялі ў гатоўнасць да сяўбы 14,4 проц. парка, гаспаладкі Наркомсоўгасаў—8,4 проц. У мінулым годзе к гэтаму тэрміну рамонтныя майстэрні выпусцілі, прыкладна, 7 тыс. спраўных машын.

ВЫБАРЫ У СОВЕТЫ ГОРАДА ЛЕНІНА

МАСКВА, 14 снежня. (БЕЛТА). 13 снежня пачаліся выбары ў советы горада Леніна. Здраніцкі страл у Смольным не зрабіў панікі ў слаўных радах піцерскіх рабочых. На гнускую вылазку класавага ворага рабочыя абавязваюцца на сходах з падвоенай энергіяй змагацца за хутчэйшае выкананне задач другой пяцігодкі.

На выбарчыя сходы рабочых **«Красного путиловца»** сабралася 35 тысяч рабочых. Перад імі адчытваўся член Ленсовета сакратар гаркома партыі т. **Угараў.** Першы ганаровы білет дэпутата Ленсовета аднадушна было пастаноўлена выпісаць на імя слаўнага кіраўніка ленінградскіх большэвікоў тав. **Кірава.** Пад бурныя авацыі выбарчыкі «Красного путиловца» пасылаюць сваім дэпутатам у совет любімага правадыра працоўных усяго свету т. **Сталіна.** Апрача таго, у совет пасылаюцца **тт. Жданаў, Угараў, Кадацкі, П. Алексеў, І. Алексеў** і лепшыя ўдарнікі завода.

На сход у Ленінградскім заводзе «Электросила» з'явіліся 100 проц. рабочых. Цёпла сустрэлі выбарчыкі выступленне героя Совецкага Саюза т. **Леванеўскага.** Дэпутатамі ў Ленсовет пасланы **тт. Кагановіч, Бушуеў** і лепшыя людзі завода.

У першы дзень у Ленінградзе выбіралі ў совет пролетарыі 28 прадпрыемстваў. Яўка на сходы — у **сярэднім 99,6 проц.**

ПАДРЫХТОЎКА ДА ГАНДЛЮ ХЛЕБАМ

МАСКВА, 16 снежня. (БЕЛТА). Па ўсяму Саюзу ідзе энергічная падрыхтоўка да надыходзячага з 1 студзеня вольнага гандлю хлебам.

У Маскве па ўдарным парадку праводзіцца рамонт 120 хлебных магазінаў і палатак спажывецкай кааперацыі. Работы ідуць круглыя суткі. На іх занята 1.600 чалавек. На спецыяльных курсах рыхтуюцца 700 прадаўцоў для новаадкрываемых хлебных магазінаў.

З Свердлоўска паведамляюць, што партыйныя і профсаюзныя арганізацыі Уралмаша стварылі 40 брыгад грамадскага кантролю над будаўніцтвам і абсталяваннем магазінаў.

У Казані адбыўся злёт работнікаў хлебных магазінаў. Удзельнікі злёту пастанавілі пачаць масавае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку магазінаў да разгортвання хлебнага гандлю. Аб'яўлен конкурс на лепшы хлебны магазін.

Ленінградская кааперацыя расшырае транспарт на дастаўцы хлебных вырабаў у булачныя.

Арганізацыі гандлёвай сеткі на продажу хлеба актыўна дапамагаюць комсамол.

У Менску, Пермі і іншых цэнтрах гаркомы комсамола арганізуюць узорныя комсамольскія хлебныя магазіны. Для работы ў пякарнях і магазінах вылучаецца лепшыя комсамольцы, якія атрымліваюць зараз на спецыяльных курсах адпаведную падрыхтоўку. У **Ростове-на-Доне** абраны камітэт комсамола праводзіць рэйд-праверку ўсіх хлебагандлёвых арганізацый краю.

На тэмы дня

АБ ЗАВОДСКАЙ АПТЭЧЦЫ

Мы за такую пастаноўку тэхнікі бязапаснасці на нашых фабрыках і заводах, каб рабочым не прыходзілася зварачацца за дапамогай у медпункт. За гэта мы вядзем барацьбу. Але што, калі здарыўся няшчасны выпадак? Дапусцім, парэзан палец.

Што астаецца рабіць? Пакінуць работу і накіравацца ў медпункт. На гэта пойдзе мінімум 10-15 мінут. Але што рабіць, калі медпункт у начной змене не працуе? Прыдзецца звярнуцца да аптэчкі і самому аказаць сабе дапамогу.

Вось тут-та і пачынаецца ўся справа. На нашых прадпрыемствах вы не знойдзеце такой аптэчкі, якой рабочы мог-бы карыстацца. Там, дзе ёсць аптэчкі, там няма медыкаментаў. Скрынкі набіты брудам і пылам.

Медпункты нядбайна адносяцца да снабжэння пэхаў медыкаментамі, яны лічаць гэта зусім непатрэбнай справай.

Вось некалькі прыкладаў. Урач войлачнай фабрыкі Шчучкіна заяўляе:

- Я супроць гэтых аптэчак... Яны нямэтазгодны, гэта толькі заграмаджае мне работу(!). Нічога, рабочы можа падыйсці да мяне ў кабінет за дапамогай...

Фабрыка працуе на тры змены, а медпункт толькі на дзве.

Не лепш на заводзе імя Молатава, дзе аптэчкі заслугоўваюць асаблівай увагі, бо тут рабочы мае дачыненне да шіл і іншых вострых інструментаў.

Рабочым даводзіцца бегаць у медпункт за дапамогай, траціць на гэта шмат часу. Ні заўком, ні ўрач. Першай на гэта не зварачаюць увагі.

Возьмем швейную фабрыку імя Крупскай. Нельга сказаць, што тут няма медыкаментаў. Іх ёсць многа. Так гаворыць урач Нервінскі.

— Але,—гаворыць ён,—я не магу даць медыкаменты цэхам, бо няма замкоў і кручкоў на скрынках, няма чым замкнуць.

Сапраўды, невырашальная задача. Не заўважылі таварышы таго, што тут-жа ў цэху вісіць замок на зусім пустой скрынцы.

На заводзе імя Варашылава наогул цяжка знайсці аптэчкі. Яны за кіданы ўсякім хламам, проста забарыкаваны і дастуціцца да іх вельмі цяжка. Але калі ўсё-ж дастуціцеся да іх, у аптэчцы вы нічога не знойдзеце.

Аптэчка - не дробязь! Гэта захаваныя галзіны рабочага часу, гэта першая дапамога ў тым выпадку, калі можна абыйсціся без медпункта.

Трэба толькі па-культурнаму, па-гаспадарску паставіць гэту справу. Аптэчка павінна знаходзіцца ў такім месцы, дзе яе нельга было-б разбіць, дзе яна лепш захавалася-б яна павінна знаходзіцца на чыстай сцяне і ў чыстым стане.

Паўтараем, аптэчка - не дробязь!

ВЕРБА І. І. — нам. наркома ўнутранага гандлю БССР

ПАДРЫХТАВАНЫМІ СУСТРЭЦЬ РАЗГОРНУТЫ ГАНДАЛЬ ХЛЕБАМ

Рад гарадоў і раёнаў выключна косна, агідна аднесліся да ажыццяўлення практычных мерапрыемстваў па арганізацыі шырокага продажу хлеба. Многія партыйныя і совецкія арганізацыі прявялі саноўна - панскія адносіны да гэтай справы.

Карма і Камарын да 7 або 8 снежня наогул не займаліся гэтай справай. Старшыня кармінскага райвыканкома тав. Грыбаедаў быў настолькі цынічна адкрыты, што адважыўся нават тэлеграфна прасіць Наркомунутгандаль адкласці разгляд пытання аб арганізацыі хлебнага гандлю ў Карме да сканчэння з'езда советаў.

У Лепелі на сенешні дзень нічога не робіцца. Вось тэлеграма, атрыманая Наркомунутгандлем ад раённага інспектара гандлю тав. Ягорава: «Будаўніцтва хлебапякарні зрываецца, памяшканне, прадастаўленае пад хлебапякарню, занята зярном. Райарганізацыі мер не прымаюць. Райсаюз бяздзейнічае, прашу ўказаняў». Такі-ж малюнак у Тураве.

Як тав. Ягораў — заг. райунутгандля ў Лепелі, так і тав. Адлоў з тураўскага райсаюза бяссрочна прабуюць замаскаваць сваю бяздзейнасць адсутнасцю дапамогі з боку партыйных і совецкіх арганізацый.

Але, не гледзячы на гэта, усё-ж ясна, што як райсаюз і райунутгандаль, так і партыйныя і совецкія арганізацыі ў Лепелі і Тураве нічога не робяць для таго, каб вырашыць пытанне арганізацыі вытворчай базы хлебапячэння і гандлёвай сеткі.

У Буда-Кашалёве па даных на 12 снежня к будаўніцтву печы не прыступалі. Людзі ніяк не могуць знайсці агнетрывалай цэглы ў той час, калі і ў Бабруйску і ў Гомелі ёсць яе колькі хочаш, а ад Буда-Кашалёва да Гомеля — гадзіна язды.

У Расонах — толькі абгуртоўваюць, з якога боку ставіць печы з правага ці з левага. Да кладкі печаў думаюць прыступіць толькі 15-16 чысла.

У Полацку хочуць атчаяцца фармальным выканаццем партыйнай дырэктывы: замест выяўлення хлебных магазінаў падбіраюць «кропкі». Пад спецыялізаваны хлебна-булачны магазін у Полацку адвялі памяшканне ў 4 кв. метры. Работнікі выканкома і горсовета яшчэ не паспелі агледзець усіх магазінаў, пакуль абмежаваліся скліканнем нарады, у якой прымаюць да ведама, што па Белхарчгандлю будзе атрыта столькі-то «кропак», па ЦРК — столькі-то «кропак» і т. д. А тое, што пад гэтымі «кропкамі» хаваюцца не магазіны, а кубатнікі, гэта не цікавіць ні Абразовіча—нам. старшыні райвыканкома, ні Песіна — старшыню горсовета. У Полацку добрыя гандлёвыя памяшканні заняты пад розныя мэты (арцель ЗРК, арцель промкааперацыі, сталовая промкааперацыі, апчалкаса і т. д.). Не гледзячы на гэта, полацкія таварышы тлумачаць сваю бяздзейнасць «адсутнасцю» памяшканняў.

Нават у такім горадзе, як Віцебск, дзе гарком партыі прадугледзеў больш увагі к разгортванню таваразвароту, і там недаацанілі пытанняў арганізацыі хлебнага гандлю. Па сутнасці ў Віцебску займаюцца тым, што перапрадаўваюць сцены старых магазінаў.

Тлумачыцца гэта тым, што гандлюючыя арганізацыі гэтых гарадоў і раёнаў не зрабілі для сябе належных вывадаў з рашэнняў пленумаў ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б. Замест баявой работы па адшукванню памяшканняў, будматэрыялаў, рабочых будаўнікоў яны займаюцца, балбатнёй аб адсутнасці нарадаў, адсутнасці памяшканняў.

Нельга трацць ні адной гадзіны. Трэба неадкладна пусціць у ход усе рычагі, каб выдзіхнуць гэты ўчастак работы.

Замест пасылкі панічных тэлеграм аб адсутнасці будматэрыялаў, трэба мабілізаваць на месцы ўсё тое, што ёсць для таго, каб быстрымі тэмпамі ў тры змены праводзіць патрэбныя будаўнічыя работы як па пабудове магазінаў, так і печаў.

Трэба, каб кожная будоўля знаходзілася пад непасрэдным наглядам кіруючых работнікаў раёна і горада.

Толькі пры гэтых умовах можна будзе нагнаць упушчанае.

Задача падрыхтоўкі вытворчай базы хлебапячэння і арганізацыі гандлёвай сеткі будзе вырашана толькі тады, калі мясцовыя партыйныя і совецкія арганізацыі ўлічаць сурёзнае большэвіцкае папярэджанне, зробленае пленумам ЦК ВКП(б).

«Вялікія і складаныя практычныя задачы, якія стаяць перад партыяй і рабоча-сялянскім урадам у сувязі з ажыццяўленнем данага рашэння, патрабуюць ад усіх партыйных, совецкіх і прафесіянальных арганізацый належнай арганізаванасці і ўліку мясцовых асаблівасцей у аператыўнай рабоце і разам з тым рашучага адпору ўсім і ўсялякім дэзарганізатарскім вылазкам класавага ворага». (З пастановы лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б).

ЯШЧЭ РАЗ АБ ЗАБЕСПЯЧЭННІ НАСТАЎНІКАЎ

АД РЭДАКЦЫІ. Змяшчаючы агляд пісем па пытаннях дрэннага матэрыяльнага становішча настаўнікаў «Звязда» просіць пракуратуру рэспублікі неадкладна заняцца гэтым пытаннем, прыцягнуўшы да судовай адказнасці тых, хто не выконвае пастанову СНК БССР аб паляпшэнні матэрыяльна-бытавых умоў настаўнікаў.

(АГЛЯД ПІСЕМ)

У чэрвені гэтага года СНК БССР даў шэрагу дырэктыву раённым і цэнтральным арганізацыям аб паляпшэнні матэрыяльна - бытавога становішча настаўнікаў.

Аб грубым парушэнні гэтага рашэння ў Дзяржынскім, Уадзенскім, Быхаўскім і інш. раёнах «Звязда» ўжо не раз сігналізавала.

Аднак, і паступаючыя з месц пісьмы ў рэдакцыю і зараз сведчаць аб тым, што ва многіх раёнах матэрыяльна-бытавое і культурнае абслугоўванне настаўнікаў стаіць зусім на нізкім узроўні.

Перад намі некалькі дакументаў. Вось аб чым піша ў сваім пісьме ў рэдакцыю настаўнік Шпілевіч з Жыткавіцкага раёна.

«У нашым раёне, як «закон», работнікі школ атрымліваюць хлеб і зарплату са спазненнем на 2-3 месяцы, а цукар і крупы атрымліваем адзін раз у год. Больш таго, старшыня Ляхавіцкага сельсовета Яўсеенка самачынна давёў план паставак бульбы з 0,20 га агароду».

Шпілевіч не раз зварачаўся ў РВК да ўпаўнаважанага ЦСПОБ, пракурора, каб прынялі меры, але-ж яму ніхто ні ў чым не дапамог.

У Петрыкоўскім раёне большасць сельпо, сельсоветаў не жадаюць займацца абслугоўваннем настаўніцтва. Настаўнікі Новаталоўчыцкай школы Галубоў, Мелінеў, Малашэвіч і Шлятаў пішуць, што новаалёкаўскае сельпо настаўнікам нічога не адпускае з промтавараў. Хлеб і табак выдаецца з вялікім спазненнем. Цукру, крупі і мыла не выдаюць зусім. Зарплата выплачваецца несвоечасова. Настаўніцы Шпак і Слексіевіч не атрымалі поўнасцю зарплаты яшчэ за жнівень і верасень.

Настаўнікі Завячэльскага сельсовета (Ушацкі раён),—піша тав. Рэжноўскі—не атрымалі за 6 месяцаў кватэрных і за 2-3 месяцы зарплату.

Гэтыя факты не адзіныя. У Старобінскім і Любаньскім раёнах настаўнікам выдаюць муку і цукар замочаным, з розным смеццем. Калі настаўнікі звярнуліся да старшыні радкаўскага сельпо (Любаньскі раён) Гарэлька ён адказаў: «Вам, хлопцы, што ёсць, то і добра».

Не менш важнае становішча мае і пытанне забеспячэння настаўнікаў кватэрамі. Многія настаўнікі знаходзяцца ў цяжкіх кватэрных умовах.

Так настаўнік Піпевіч піша:

«У гэтым годзе мяне перавялі ў Ляхавіцкую школу (Жыткавіцкі раён). На маім утрыманні знаходзяцца: бацька 75 год, матка —74 і дзіця. З-за адсутнасці кватэры сям'я мая знаходзіцца ў другой вёсцы, што перашкаджае маёй нармальнай рабоце. На мае неаднаразовыя просьбы аб прадастаўленні мне кватэры старшыня сельсовета не зварачае ўвагі».

Прыведзеныя вышэй факты сведчаць аб бюдушных адносінах не толькі з боку нізавых работнікаў, але з боку раённага кіраўніцтва да штодзённых патрэб настаўнікаў.

Гэтыя факты патрабуюць ад РК КП(б)Б і РВК прыняцця рашучых мер, знішчэння чыноўніцка-панскіх адносін да настаўнікаў, даўшы ім магчымасць праводзіць нармальна работу ў школах, прыцягнуўшы вінаватых да адказнасці.



НА ЗДЫМКУ: Нававыбраная старшыня Сакалішчанскага сельсовета БССР тав. КАВАЛЕНКА перад ад'ездам на кароткатэрміновыя курсы па совецкаму будаўніцтву, дае сакратару сельсовета Лучэнкову ўказанні па складанню плана работ сельсовета ў разрэзе наказа выбаршчыкаў.

Маленькі фельетон

КЕБЯСПЕЧНЫЯ ПАШТАВІКІ...

У Саратаве на пошце, над адным з акенцаў, красуецца надпіс: «Выдача пераводаў па тэлеграфу».

У гэты дзень каля акенца пікай чаргі не было.

Азіраючыся па баках, незнаёмая нам жанчына заўважыла, нарэшце, гэты надпіс і, прашыпеўшы праз акенца позву, цяжка сказала:

— Сума дробная... Знаёмыя рас казвалі, што ў мінулым годзе адзін член саюза медсанпрацы атрымаў гэткую-ж суму... Грошы таксама былі пераведзены па тэлеграфу, а між тым нічога не было пераблытана...

Паштовы служачы дастаў тэлеграфны перавод, павадзіў па ім акулярамі і, не спяшаючыся, адказаў:

— Я так мяркую, што фэльетоны, якія пішуць пра блытаніну на пошце ды пра тэлеграфныя памылкі, не праўдзівыя.

Паштавік адчыніў касу, адлічыў 50 руб. і задаволена заключыў гаворку:

— А вы турбаваліся... Тэлеграфная лінія Менск—Саратаў працуе беспамылкова... Выбачайце... Адна маленькая фармальнасць—у вас пашпарт пры сабе?

Жанчына працягнула пашпарт паштавіку.

Паштавік уважліва паглядзеў на пашпарт, потым на тэлеграфны перавод, потым зноў на пашпарт.

— У вас у пашпарце памылка... — лакончна заўважыў ён. Па пашпарту, малады чалавек, вы лічыцеся жанчынай Ірмай Іванаўнай Лінскай... Бачыце, малады чалавек, нават у пашпарце і то бываюць памылкі... — з выглядам яўнай перавагі ўшпкнуў паштавік.

— Дык я-жа жанчына і ёсць... —пацвердзіла кліентка.

Галава паштавіка высунулася праз акенца і, недаверліва пахістаўшыся, адказала:

— У пераводзе ясна напісана Ярому Іванавічу Былінскаму... Разумееце? Каму? Яму!... Ярому Іванавічу...

— Дык чаму вы мяркуеце, што памылка крыецца іменна ў пашпарце, а не ў тэлеграфным пераводзе?

— У пераводзе, малады чалавек, напісана ясна... — раздражаўся служачы... Ну, але калі вы так настойваеце на тым, што жанчына, мы можам зрабіць тэлеграфны запрос з Менска... Праз тры дні прыходзьце за адказам...

.... Роўна праз тры дні жанчына зноў была каля акенца.

— Ну, вось і ўсё ў парадку!.. — весела сустрэў яе паштавік. Сам намеснік наркома сувязі тав. Расін загадаў высветліць гэту памылку... У нас нават памылак зараз суровa... Тав. намеснік наркома высветліў, што памылку зрабіла Менская пошта.

Жанчына павальней уздыхнула.

— Менская пошта, тлумачыў ён далей — па тэлеграфу выправіла сваю памылку. Вось чытайце тэлеграму з Менска — замест памылкова адрасаванага Ярому Іванавічу Былінскаму выдайце перавод Гіршу Іванавічу Былінскаму.

Убачыўшы замяшанасць жанчыны, паштавік папярэдліва і чула дадаў:

—Вам, малады чалавек, трэба схадзіць у пашпартны стол. Выдайце гэтых цвёрдалобых бюракратаў! Няхай яны хутчэй выправяць вам пашпарт. Няхай напішуць у пашпарце так, як сказана ў апошняй тэлеграфа і будзе канец усёй цягаціне.

— Ды на што-ж перапраўляць імя ў пашпарце, калі я ад нараджэння і ёсць Ірма Іванаўна— усхвалявана адказала жанчына.— Яшчэ зусім маленькай мяне называлі Ірмачкай. Разумееце? Прычым-жа тут Гірш?

— Не хочаце?—зжэўлена ўглядаючыся ў твар жанчыны, перапытаўся паштавік. — І зусім дарэмна — 50 руб. таксама грошы, а імя Гірш Іванавіч нават гучней...

. . . . . .

Мы не ведаем, ці ўтаварыў кліентку саратаўскі супрацоўнік пошты змяніць сваё імя на тое імя, якое ёй вызначыў Менскі тэлеграф.

Адно толькі мы ведаем дакладна — у такіх выпадках мяняць трэба не імёны кліентаў, а тых, хто блытае.

Так няхай намеснік наркома сувязі, аўтар шырэйшага і вялікага.

АЛЕША.

„КАЛІ БУДУЦЬ ПРАДПАСЫЛКІ"

МСЦІСЛАЎЛЬ. (Па тэлеграфу ад карэспандэнта «Звязды»).

У Мсціслаўлі да гэтага часу амаль нічога не зроблена для практычнай рэалізацыі пастановы пленума ЦК ВКП(б) аб адмене картачнай сістэмы. У райсаюзе наўпэўнена заяўляюць:

— Адкрываем дзве спецыялізаваныя крамы і адно хлебнае аддзяленне ў пралуктовым магазіне. Агульнае становішча на сёнешні дзень і для нас саміх туманна (!?) Калі выявіцца, што трох крам мала для задавалення попыту насельніцтва, тады будзем думаць аб адкрыцці новых.

Пакуль што кіраўнікі райсаюза збіраюцца выпякаць толькі два гатункі хлеба. «Калі будуць прадпасылкі (?). —гаворыць яны, — будзем выпякаць і кандзіцерскія вырабы».

Да рамонту двух законсерваваных і двух функцыянуючых печаў пякарні дагэтуль не прыступалі.

В. АНЭТ.

АД РЭДАКЦЫІ: Тэлеграма нашага карэспандэнта сведчыць, што ў Мсціслаўлі яшчэ не ўсвядомілі значэння пастановы пленума ЦК аб адмене картачнай сістэмы і задач, якія выцякаюць з гэтай пастановы. Замест неадкладнага разгортвання практычнай падрыхтоўкі да шырокага гандлю высокакласнымі хлебнымі кандзіцерскімі вырабамі ў Мсціслаўскім рэйсаюзе разважаюць аб нейкіх «прадпасылках». Пад шырокім асартыментам мсціслаўскія камбінаты разумеюць... два гатункі хлеба.

«Звязда» лічыць такія адносіны да рэалізацыі пастановы пленума ЦК простым злачынствам і чакае ад Мсціслаўскага РК КП(б)Б і РВК канкрэтнага адказу.

ПА ЛІНІІ НАЙМЕНШАГА СУПРАЦІЎЛЕННЯ

Для рэалізацыі пастановы пленума ЦК ВКП(б) аб пашырэнні хлебнай гандлёвай сеткі горспажыўсаюз арганізоўвае па Менску 16 дадатковых магазінаў. Але кіраўнікі горспажыўсаюза пайшлі па шляху найменшага супраціўлення.

Замест таго, каб вышукаць новыя памяшканні, незанятыя магазінамі, горспажыўсаюз пачаў ліквідаваць магазіны мануфактурныя, галантарэйныя, галаўных убораў і на іх месца будаваць хлебныя магазіны.

Мы раім кіраўнікам горспажыўсаюза і горсовета прайсціся па Ленінскай і Совецкай вуліцах, каб убачыць, што шмат памяшканняў, прыстасаваных пад магазіны заняты канцылярыямі. У доме Комунбанка — Белдзяржснаб, па Совецкай 63 — Белплодагароднінна, побач пратэзная майстэрня, па Ленінскай 16 — гадзіннікавая арцель «Новы шлях», на плошчы Волі — МенАЗЕТ і т. д.

Горсовет і кіраўнікі гандлюючых арганізацый ні ў якім разе не павінны ісці па шляху скарачэння ўжо існуючай сеткі.

МУЖНЫ УЧЫНАК КАРЛА ЛІБКНЕХТА

(Артыкул нямецкага комуніста Ф. Вінтэра, напісаны спецыяльна для „Звязды"

КАРЛ ЛІБКНЕХТ.

20 год таму назад, 2 снежня 1914 года, германскі рэйхстаг сабраўся на пасяджэнне. У парадку дня стаяла зацвярджэнне ўрадавай прапановы другой паловы ваеннага бюджэта. На фракцыйным пасяджэнні сацыял-дэмакратычнай фракцыі рэйхстага перад пачаткам пасяджэння рэйхстага КАРЛ ЛІБКНЕХТ заняў з усёй сілай катэгарычнасцю пазіцыю супроць урадавай прапановы і патрабаваў адхілення не поўнасцю ўсёй сацыял-дэмакратычнай фракцыяй. Аднак, са 110 дэпутатаў знайшлося мала, якія падтрымалі пункт гледжання Карла Лібкнехта. Але і яны, нарэшце, падпарадкаваліся дысцыплінэ партыі, яны ўступілі партыйнаму кіраўніцтву, пусціўшаму ў ход шавіністычнае цкаванне.

Пасяджэнне рэйхстага пачалося. Урадавыя лаўкі былі пакрыты афіцэрскімі мундзірамі. Пасля матывіроўкі прапановы рэйхсканцлерам мяшчанскія партыі выказалі сваю згоду (на бюджэт) член прэзідыума сацыял-дэмакратычнай партыі Гюго Гаазе зачытаў дэкларацыю, якая, як і 4 жніўня, у другі раз падкрэслівала волю «баранціць бацькаўшчыну».

Раптам па зале пасяджэння прайшле хваляванне. Карл Лібкнехт выступаў з прамовай. Як толькі ён сказаў некалькі слоў, уся мяшчанская зграя пачынае выць «Здраднік бацькаўшчыны», «мерзавец» і таму падобныя выкрыкі насуцца па адрасу Лібкнехта. Такія-ж самыя выкрыкі чуваць па адрасу Карла Лібкнехта і з лавак сацыял-дэмакратычнай фракцыі. Але мужна, непахісна, спакойна і стрымана, усведамляючы сваю вялікую сусветна-пролетарскую місію стаяў Карл Лібкнехт на тры бучне і вострым, рэжучым голасам прачытаў дэкларацыю для ўгрунтавання свайго адмоўнага пункту гледжання.

«Справа ідзе аб імперыялістычнай вайне, аб вайне для капіталістычнага панавання на сусветным рынку і палітычным панаванні індустрыі і банкаўскага капітала буйных краін. Справа ідзе аб імперыялістычнай гонцы ўзбраенняў нямецкіх і аўстрыйскіх ваенных колаў, шкодная для прамаўства, у цемры поўабсалютызма і тайнай дыпламатыі, выклікаўшай вайну. Справа ідзе таксама аб банапартысцкіх мерапрыемствах для дэмаралізацыі і развіцця ўздымаючагася рабочага руху... Германскія лозунгі «супроць царызма» падобны англійскім і французскім лозунгам «супроць мілітарызма» — мэце, якая мабілізуе благароднейшыя інстынкты, рэвалюцыйныя імкненні і надзеі народу і яго класавую нянавісць. Германія — суўдзельніца царызма, узор палітычнай рэакцыі — на сёнешні дзень не мае піжага намеру для вызвалення народаў. Вызваленне рускага народу, як і германскага, павінна быць адной справай».

Дэкларацыя Лібкнехта, якую не далі магчымасці дачытаць да канца, не была занесена ў пратакол рэйхстага, не была апублікавана ў друку. Друк разгарнуў шалёнае цкаванне супроць «здрадніка бацькаўшчыны», і сацыял-дэмакратычнае партыйнае кіраўніцтва з абурэннем асудзіла «парушальніка дысцыпліны». Але дэкларацыя Лібнехта стала вельмі хутка вядома. Група «Інтэрнацыянал» — пазней Саюз спартакаўцаў — надрукавала і распаўсюдзіла яе. Дэкларацыя Лібкнехта распаўсюджвалася за межамі краіны, пранікала ў дамы і казармы, пасылалася салдатам на фронт.

Толькі той, хто перажыў гэты час, можа правільна зразумець, якое велізарнейшае значэнне мела выступленне Лібкнехта пасля таго як — за выключэннем большэвікоў пад кіраўніцтвам ЛЕНІНА—сацыял-дэмакратычныя партыі ўсіх краін, якія ўдзельнічалі ў вайне, дэзертыравалі з развіваючымся сцягамі ў лагер буржуазіі і бараніілі іх «бацькаўшчыну», пасля гэтага ўсе ідэалы і надзеі сацыял-дэмакратычных членаў партыі былі патаптаны ў балота. Выступленне Карла Лібкнехта было яркім праменем у беспрасветнай цемры. Яго паступак 2 снежня быў самым радасным для ўсіх тых, каму дарагі сацыялізм. Карл Лібкнехт узняў чырвоны сцяг інтэрнацыянальнай салідарнасці на барацьбу супроць імперыялістычнай вайны.

Якое рэха знайшло выступленне Карла Лібкнехта ў рэйхстагу — аб гэтым сведчаць шматлікія пісьмы, што атрымліваў Карл Лібкнехт з акопаў і лазаратаў, ад партыйных таварышоў і партыйных арганізацый, ад рабочых і служачых, а таксама і ад мяшчанскіх колаў. У іх выражаецца як роспач, так і новыя надзеі, новы прыліў мужнасці, новая вера ў сацыялізм і яго місію.

Адзін салдат пісаў з лазарэта ў Зрэнбургу ў вялізным пісьме паступнае:

«Што мяне больш за ўсё вымушае пісаць Вам, дарагі таварыш Карл Лібкнехт, гэта наступнае: мы знаходзімся ў полі. Пакольні мы раней былі партыйныя таварышы, мы адкрыта дыскусавалі Ваш пункт гледжання аб ваенным бюджэце і ўсе радасна віталі Ваш пункт гледжання. Нас было 12 таварышоў і мы ў акопах доўга і сурёзна гутарылі аб сацыял-дэмакратыі і вайне. Мы былі таксама той думкі, што дазвол на ваенныя крэдыты пярэчыць нашай праграме і нашым галоўным прынцыпам. Мы вельмі радаваліся за вас, што вы верны абараняеце ўсе нашы рэвалюцыйныя перакананні, і ўсе былі такога пераканання: Лібкнехт — адзіны з чэсных малы, якога мы маем у партыі. Гэтай-жа думкі зараз і большасць таварышоў тут у лазарэце».

Прыкладам самых ветлівых выказванняў моладзі з'яўляецца наступнае пісьмо:

«У той час, калі Вы ў Германіі адзін сярод партыйных таварышоў і нажылі дзякуючы Вашаму выступленню так шмат ворагаў, мы Вам асабліва спачуваем і выказваем гэтым наша давер'е».

Шмат ішло да Лібкнехта дэкларацый згоды з ім і прывітанняў ад партыйных арганізацый і дысцыплінарных гурткоў. Старыя барацьбіты з часоў заснавання партыі віталі смелага інтэрнацыяналіста. З Офенбаха адзін стары барацьбіт пісаў:

«Я шчыра і ад усяго сэрца рад, што вы выразаны з такога дрэва».

Таксама і з мяшчанскіх колаў ішло шмат пісем. У адной адкрытцы, атрыманай праз пошту рэйхстага, пішацца:

«За Ваша мужнае, поўнае сілы выступленне супроць сёнешняй бюджэтнай прапановы выказваем Вам наша поўнае спачуванне. Вы даказалі любоў да радзімы як адзіны дальназоркі інтэлігент.

Трое грамадзян, якія, на жаль, мелі менш мужнасці, чым Вы».

Так паслужыла смелае выступленне Карла Лібкнехта супроць распальвання вайны і шавінізма магутным рычагом для арганізацыі антываеннага фронта ў Германіі. З групы «Інтэрнацыянал» развіўся Саюз спартакаўцаў, папярэднік комуністычнай партыі. Асаблівае ўражанне зрабіла выступленне Лібкнехта на рускіх таварышоў. Ленін шанаваў Карла Лібкнехта як мужнага, непахіснага інтэрнацыяналіста.

Германская буржуазія арыштавала Карла Лібкнехта на першамайскай дэманстрацыі 1916 г. Яна прысудзіла яго к чатырём гадам катаргі, але Карл Лібкнехт быў і астаўся праўдзівым рэвалюцыйнага пролетарыята, які загінуў у кастрычніку 1918 г. свайго вызвалення. Аднак, не доўга мог Карл Лібкнехт аддаваць свае сілы на службу рэвалюцыі. 15 студзеня 1919 г. ён быў зверскі забіт мяшчанска-афіцэрскай контрэвалюцыяй.

Але Карл Лібкнехт, дзякуючы выступленню 2 снежня 1914 г. дзякуючы яго вернасці інтэрнацыянальнаму пролетарыяту, і пролетарскай рэвалюцыі стаў бессмертным, стаў велізарнейшым героем.

У ГАРАДКУ І ЧАВУСАХ РАСКРАДВАЮЦЬ І СПЕКУЛІРУЮЦЬ ІЛЬНОМ

Толькі цвёрдай і рашучай барацьбой з сабатажнікамі і раскрадвальнікамі, арганізацыяй дапамогі адстаючым калгасам і аднаасобнікам у пераапрацоўцы і здачы ільну можна дабіцца завяршэння плана ільнозагатовак

Адкрытая спекуляцыя ільном

ГАРАДОК, 11. (Па тэлефону ад карэсп. «Звязды»).

Калі раней у некаторых работнікаў Гарадоцкага раёна было сумненне, ці ёсць лён, ці не, то факты апошніх дзён, калі ў кожным сельсавеце, кожнай вёсцы ідзе вуны перапродаж і спекуляцыя ільном, ясна гавораць, што ільну ў раёне ёсць у дастатковай колькасці.

У той час, калі калгасы падыходзяць да стопроцантнага выканання плана, а асобныя калгасы здаюць звыш плана, аднаасобны сектар разка адстае. Аднаасобнікі па Мехаўскаму сельсавету выканалі ўсяго 66 проц. плана. Аднаасобнікі вёскі Старыня, Мехаўскага сельсавета, павінны здаць па кантрактацыйнаму дагавору 44 цэнт. трасты і 12 цэнтн. валакна. Здана ўсяго 3 цэнтнеры трасты і 2 цэнтн. валакна. Аднаасобнікі Фёдараў Іван, Дземіцёнак Антон, Галоўка Ягор яшчэ не прыступілі да здачы валакна. Гатовае-ж валакно гэтыя аднаасобнікі прадаваць вязуць у Невель.

На скобінскім пункце з 40 цэнтн трасты і 6 цэнтн. валакна, якія павінны здаваць аднаасобнікі па кантрактацыйнаму дагавору, на 10 лістапада паступіла толькі 2½ цэнтн. валакна.

У Обельскім сельсавеце рашылі што, дасягнуўшы 68 проц. плана, больш наогул не варта ільном займацца. Гэта прывяло да таго, што ўжо больш месяца як з гэтага сельсавета не паступіла ні аднаго кілограма ільну.

Затое, калі хочаце купіць лён, то прыязджайце ў Обельскі сельсавет і там па 8 руб. клг. ільну і 1 руб. клг. трасты можаце дастаць колькі хочаце.

Аб тым, што пры ўмелай пастаноўцы масавай работы можна дабіцца перавыканання плана не толькі па калгасах, але і па аднаасобнаму сектару, гаворыць вопыт Выраўлянскага і Рудзянскага сельсоветаў. Пасля таго, як гэтыя сельсоветы выканалі 110 проц. плана, асобныя работнікі палічылі, што ў гэтым сельсавеце няма чаго рабіць, там няма больш ільну. А калі туды паехалі здольныя работнікі, яны дабіліся, што аднаасобнікі Выраўлянскага сельсавета выканалі 115 проц. плана і што аднаасобнікі Рудзянскага сельсавета выканалі 176 проц. гадавога плана. Раённае кіраўніцтва займаецца заклінаннямі. Гэта прывяло да таго, што апошняя пяцідзённка дала толькі 1 проц. прыросту. Наступныя дні даюць яшчэ большае зніжэнне тэмпаў.

Намеснік сакратара РК т. **Касой** прывёў цэлы спіс людзей, якія знаходзяцца ў раёне. 9-га, пасля таго, як атрымалі газету «Звязда», дзе раён занесен канцлагам на чорную дошку, адправілі яшчэ 30 чалавек у раён. Бяда толькі ў тым, што людзі, уязджаючы па раён, забываюць, што яны нясуць такую-ж адказнасць за выкананне плана ільнозагатовак, як і сельсавет. Яны сядзяць у канцэлярыі сельсавета, у калгасах і на пасёлках іх не відаць. А РК партыі ні разу не падумаў над тым, каб праверыць, што робяць упаўнаважныя ў сельсоветах.

НЕЙДЛІН.

Крывая хутка падае

ЧАВУСЫ, 14. (Па тэлефону ад карэсп. «Звязды»).

Ход ільнозагатовак па раёну за апошнія тры пяцідзённкі падрыхтоўкі да раённага з'езда советаў ідзе на зніжэнне. Так, калі з 1 па 5 снежня быў загатоўлен 1 проц. раённага плана, то з 5 па 10 — 0,7 проц., а з 10 па 15—0, 6 проц. Раённы план выканан зараз на 76 проц. Раённае кіраўніцтва не выкарыстала гэты перыяд падрыхтоўкі да раённага з'езда советаў для мабілізацыі ўсёй масы калгаснікаў і аднаасобнікаў на выкананне такой першачарговай задачы як ільнозагатоўкі. Раённыя работнікі замест таго, каб бязвыезна сядзець у сельсоветах, калгасах, вёсках, спакойна адпачываюць у сваіх кабінетах. І толькі пры атрыманні зводак Заготільна пацісканюць плячмі і задаюць сабе пытанне:

— Чаму так марудна выконваецца план, калі-ж гэтаму будзе канец?

На такое пытанне адказ можа быць толькі адзін: не ўлічылі ўрокаў мінулага года. Чавуская партарганізацыя дапусціла масавае раскрадванне калгасна ільну. За гэта гаворыць шматлікія факты і прыклады. Калі ў калгасах прыходзіцца ўсе культуры, то ільнотрэста, як правіла, ніадзе не прыходзіцца. Гэта стварыла глебу для масавага развалакавання трасты. Вось у калгасе імя Калініна Хапэтаўскага сельсавета лён урадзіў не дрэнна, але калгас план свой не выканаў. Чаму? Лён раскралі самі калгаснікі і зараз яны прадаюць яго па цане за пуд валакна 6 пудоў хлеба.

Калгас «Перамога» і калгас «Дружба» таго-ж сельсавета сеялі аднолькавую плошчу ільну. У калгасе «Перамога» лён урадзіў лепшы, але калгас «Дружба» свой план выканаў, а «Перамога» не.

14 снежня ў раёне быў кірмаш. Варта было толькі прайсці між возаў, як можна было ўбачыць масавы продаж ільноваланна і пянькі па спекуляцыйных цэнах. Хто прадае валакно? Прадаюць аднаасобнікі, пядаўна ўступіўшыя ў калгасы, якія не выконваюць сваіх абавязацельстваў па ільну, лічачы, што гэта пройдзе міма іх. Прадаюць і ліквідкалгаснікі крадзены калгасны лён. Не гледзячы на тое, што раён далёка яшчэ не выканаў свайго плана загатовак, у раёне гэтаму факту не надаюць ніякага значэння. Продаж валакна адбываецца на вачах міліцыянераў.

Газоўчы аб міліцыі, нельга абыйсці пракуратуру. У раёне наглядаецца масавыя падробкі ільняных абавязацельстваў аднаасобнікамі. Але пракуратура ніякіх мер да іх не прымае. Аднаасобнік Казлоў Еўдакім, Жаліўскага сельсавета, здаў валакна 2 кгл., падрабіў абавязацельствы на 20 кгл. Месяц таму назад яго справы перадал пракурору, але мер не прынята.

Тэрміны здачы валакна дзяржаве даўно прайшлі. У раёне не прымаюць жорсткіх мер да сабатажнікаў ільнездачы. З сабатажнікамі ліберальнічаюць. Усё гэта і прыводзіць да таго, што загатоўкі ільну па раёну спыняюцца.

ВІШНЕЎСКІ.

ПІСЬМЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ

САКРАТАРУ ЧЫРВОНАПОЛЬСКАГА РК КП(б)Б тав. ЛАПАЦІНУ.

РАСКРАДВАЮЦЬ КАЛГАСНУЮ МАЕМАСЦЬ

(ПІСЬМО КОМСАМОЛЬЦАЎ)

Калгас імя Молатава, Казельбудскага сельсавета, Чырвонапольскага раёна, мае ўсе магчымасці быць перадавым калгасам у раёне.

Але старшыня калгаса **Сібенькоў** (ён-жа партарг) гэтаму перашкаджае. За 1934 год у калгасе прапала 30 свінаматак. У часе сенаўборкі ў другой брыгадзе згніло 5 га скошанага сена.

Старшыня калгаса Сібенькоў сістэматычна п'янствуе. Ён сумесна з кладаўшчыкам. Пастуховым прапілі 700 руб. калгасных грошай. Старшы па малацьбе Вытан Я. адпраўляе ў кладовую незважанае збожжа і гэтым дае магчымасць раскрадваць яго. Старшыня рэўкамісіі Паскоіны Язэп за ўвесь год не зрабіў ні адной рэвізіі.

Крытыка і самакрытыка ў калгасе не ў пашане. На агульных сходах калгаснікі баяцца крытыкаваць кіраўніцтва калгаса.

У часе авансавання калгаснікаў не прытрымліваліся выпрацоўкі працадзён, а збожжа і бульбу Пастухоў выдаваў каму як папала.

ЦЕРАХАЎ, ШАТУРА
ЦЕРАХАЎ С., ЯЎГЕНАЎ А.

СТАРШЫНІ ГОРАЦКАГА РВК тав. ЖУКУ.

ЯСЛІ ЗАКРЫЛІ... ЧАГОВА

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАЙ)

На час рамонту будынка Горацкага сельска-гаспадарчага інстытута былі часова закрыты дзіцячыя яслі. Прашло ўжо два месяцы пасля рамонту, а яслі так і не працуюць.

Пакой, у якім знаходзіліся яслі, забралі для інтэрната.

Каля 50 студантак і навуковых працаўніцы, ідучы на заняткі, не маюць дзе пакідаць сваіх дзяцей.

Загадчыца ясель не раз зварачалася ў райсаўраў і горсовет, але ніхто не аддае гэтаму ўвагі.

КАБАЧЭЎСКАЯ.

НАМ ПІШУЦЬ

Тав. **М. Сухан** піша, што за апошні час па Карытнянскаму сельсавету (Асіпавіцкі раён) арганізаваліся тры новыя калгасы: імя Сталіна, Варашылава і Калініна, у якія ўвайшла 221 гаспадарка.

**

На **Бебруйскім** дрэвакамбінаце, піша тав. **І. Хейман**, не выконваюць прапаноў рабочых аб тым, каб прыносіць зарплату рабочым да вагштатаў.

Пры выплаце грошай утвараюцца вялікія чаргі, шум і т. д. Але ні партком, ні заўком, ні дырэкцыя да гэтага мер не прымаюць.

**

Не раз я звяртаўся ў **Любанскую** кантору лесасплаву за атрыманнем заробленых 60 руб. грошай. Але і дагэтуль грошай так і не атрымаў. — Піша **Д. Казлоўскі.**

**

Студэнт Стэльмашэнзи Смілавіцкага сельскагаспадарчага тэхнікума паведамляе, што яны заключылі соцумову з загадчыкам смілавіцкага дома соцкультуры (Пухавіцкі раён) на падачу 8 раз у месяц кіно-карцін. Але гэта толькі на паперы.

САКРАТАРУ КАСЦЮКОВІЦКАГА РК КП(б)Б тав. ЛІСКОВІЧУ.

Пісьменкоў збівае калгаснікаў

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Старшыня калгаса **імя КАЛІНІНА**, Бялынкаўскага сельсавета **Пісьменкоў Васіль** самым грубым чынам адносіцца да калгаснікаў. Пісьменкоў не адмаўляецца нават ад такіх метадаў уздзеяння, як збіццё.

Калгаснік **Сіверчанка Лаўрэн** напісаў пра Пісьменкова заметку ў раённую газету «Сталінскі прызыў». За гэта ён збіў Сіверчанка. Пісьменкоў збіў калгасніка Дземідзенка за тое, што ён звяртаўся да яго па пытанню запісу працадзён.

Усё гэта праходзіць яму беспакарана.

ЦАЛКО.

АД РЭДАКЦЫІ. Факты грубага парушэння рэвалюцыйнай законнасці вельмі характарны для КАСЦЮКОВІЦКАГА раёна. Сігналы аб грубым адміністраванні і ізбіцці ў Ялавецкім сельсавеце і соўгасе Смолькі не з'явіліся сюрпрызным.

РАЙПРАКУРОРУ АСІПАВІЦКАГА РАЕНА тав. ЛЕЯЛАНДУ.

Чаму нам не выплачваюць заробленых грошай?

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКАЎ)

Мы, калгаснікі калгаса **«Чырвоны будаўнік»**, Балоцкага сельсавета **(Пухавіцкі раён)**, у маі гэтага года працавалі на лесасплаве ад **Свіслацкай** сплаўканторы, **Асіпавіцкага** раёна.

Кіраваў работай дзесятнік сплаўканторы Герман. Работу сваю мы выканалі своечасова і добрасумленна. Між тым зарплату за работу не атрымалі і да сёняшняга дня.

За разлікам нам прыходзілася некалькі раз звяртацца ў сплаўкантору і да дзесятніка Германа. Але ўсё безрэзультатна.

— Няма грошай,—увесь час чуем адказ.

Дакуль будуць працягвацца гэтыя здзекі?

КРУК, ЧАРАПОК, ДЗЯТЛЕНАК і інш. (усяго 9 подпісаў).

АД РЭДАКЦЫІ. «ЗВЯЗДА» атрымлівае цэлы шэраг пісем і скаргаў аб тым, што некаторыя гаспадарчыя арганізацыі затрымліваюць выплату заробленых грошай.

Асабліва недапушчальнае становішча Свіслацкай сплаўканторы. Тут 18 калгаснікаў яшчэ не атрымалі грошай, заробленых яшчэ ў маі г. г.

«ЗВЯЗДА» звяртае на гэта ўвагу райпракурора Асіпавіцкага раёна і патрабуе неадкладнага рэагавання, прыцягнуўшы вінаватых да суровай адказнасці.

По следам писем

„Менскія аптэкі гандлююць гнілымі дражджамі"

Рабкор Дзмітрук у пісьме («Звязда» № 273 ад 6 снежня) пісаў аб тым, што менскія аптэкі прадаюць піўныя дрожджы, якіх прымаць нельга, бо ўсе яны пакрытыя цвіллю, прыбяком, с многія зусім гнілыя.

Кіраўнік аптэк № 3 і 6 паведамляе, што пры водпуску дражджаў шостая аптэка звярнула ўвагу на іх недобраякаснасць, аб чым паведаміла Белаптэкакіраўніцтву, адначасова спыніўшы водпуск апошніх.

Дражджы па шостай аптэцы ў колькасці 222 трубак былі вернуты на склад.

АД РЭДАКЦЫІ: Друкуемы адказ на пісьмо Дзмітрука кіраўніка аптэк № 3 і 6 не з'яўляецца вычарпальным. А як-же абстаіць справа ў іншых аптэках і парках санітарыі і гігіены?

«ЗВЯЗДА» патрабуе ад Наркома аховы здароўя (якому да рэчы, было адначасова гэта пісьмо) вычарпальнага адказу па сутнасці пісьма т. Дзмітрука.

„Выбары правялі без справаздачы горсовета"

Пад такім загалоўкам у «Звязде» за 23 лістапада было змешчана пісьмо Кагана аб тым, што выбарчы сход у г. Мсціслаўлі быў праведзен пры ўдзеле мейш паловы выбаршчыкаў. Позвы былі ўручаны за 1 месяц.

На змешчанае пісьмо т. Кроля, («Звязда» за 2 лістапада) аб тым, што магілеўская больніца патрэбна дапамога. Магілеўскі РК КП(б)Б паведамляе за дрэнную работу па кіраўніцтву больніцай імя т. Семашка зняты з пасады дырэктар больніцы Азеншарф. Зараз больніца поўнасцю забяспечана электрасветам. Прымаюцца меры па паляпшэнню забеспячэння больніцы апаратам і прадуктамі харчавання.

Мсціслаўская раённая выбарчая камісія паведамляе выбары адменены, праведзены паўторныя. Памылкі, указаныя ў пісьме, выпраўлены.

ПЛАДЫ „ЗАГАДВАННЯ" ЛОСІКА

Загадчык дамамі жанта № 46 тав. ЛОСІК зусім не займаецца сваёй непасрэднай работай. Ён больш цікавіцца чаркай і гармошкай. Лосік не ведае, што робіцца ў домах жанта. Між тым, жыхары сякуць дровы ў кватэрах, псуюць падлогі, збіваюць атынкоўку, у кватэрах грязь, антысанітарыя.

ТЫШКЕВІЧ.



ПА СЛЯДАХ НЕАПУБЛІКАВАЧЫХ ПІСЕМ

Тав. Прыбыш з Парыцкага раёна пісаў у «Звязду», што старшыня Макавішкага сельсавета Кабанчук не рэагаваў на скаргі аднаасобнікаў.

Парыцкі РВК паведамляе: прыведзеныя факты **пацвердзіліся**, Кабанчук **з работы знят.**

***

25 кастрычніка г. г. «Звязда» атрымала допіс ад рахункавода калгаса Вусела А. аб тым, што ў калгасе «Ленінская перамога», Кадзіўскага сельсавета (Парыцкі раён) у результаце варварскіх адносін да жывёлы пала чацвера коней і абарціравалі тры кабылы.

Парыцкі райсад паведамляе: за падзеж і абарціраванне коней, старшыня калгаса **Сонуч Іван з работы знят і разам з іншымі вінаватымі аддан пад суд. Калгаснік Мурэ-**лей А. за дрэнныя адносіны да коней аштрафаваны на 10 працадзён.

Тав. Гуцаў з Талачынскага раёна звярнуўся ў «Звязду» са скаргай на тое, што раённыя арганізацыі не прадастаўляюць друкарні належнага памяшкання, што перашкаджае нармальнаму выхаду палітаддзельскай і раённай газет. Пісьмо гэта «Звязды» было накіравана ў Талачынскі РК КП(б) для прыняцця мер.

Сакратар РК КП(б)Б т. Турык паведамляе нам. Памяшканне друкарні **ўжо прадастаўлена, чым створаны зусім нармальныя ўмовы для работы друкарні і раддзелаў на выпуску газет.**

ПАРТГАБІНЕТАМ У КРУПКАХ ЗАГАДВАЕ... МАШЫНІСТКА

У райком партыі зайшоў паліткіраўнік вучэбнага пункта тав. Дзямчукоў. З абурэннем ён скарджацца, што абегаў усе крупскія ўстановы, ператрос усе архівы і не знайшоў нідзе рэзалюцыі ліквідскага пленума ЦК ВКП(б) аб развіцці соцыялістычнай жывёлагадоўлі. А гэты дакумент патрэбен для заняткаў з дапрызыўнікамі. Заўтра такая тэма.

Дзямчукова скаргі выслухоўвалі, спачуваюча ківалі галовамі, але дапамагчы нічым не маглі.

Бездапаможным у гэтай справе аказаўся і партгабінет. Ён стаіць недаступным, моцна ўзяты на замок. Паліткіраўнік настойліва просіць адкрыць габінет.

Машыністка Лускіна (загадчыца па сумяшчэнню габінетам за дадатковыя 50 руб. у месяц) прыбытна апраўдваецца:

— Са здавальненнем-бы адкрыла ды ключ у прыбіральнічцы. А яе зараз днём з агнём не знойдзеш.

У гэты час у райком зайшоў начальнік чалітаддзела МТС Ракаў. К вялікаму шчасцю заклапочанага паліткіраўніка ў палявой сумцы начальніка знайшліся рэзалюцыі ліквідскага пленума ЦК ВКП(б). «Выручаны» з цяжкага становішча паліткіраўнік ўдзяч на развітаўся і, спяшаючыся, пашоў на вучпункт.

Праз некаторы час агульнымі намаганнямі ўдалося адкрыць партгабінет. Увайшоўшы першай, т. Лускіна, нібы па камандзе кіраўніка на спартыўнай пляцоўцы, зрабіла глыбокі ўдых і моцна ахнула.

— Во, бачыце, — «самакрытычна» заявіла яна, — якая тут халадэча.

І праўда, у Крупках няма ахвотнікаў сядзець за кнігай у халоднай пуні. А на дом кніг не даюць. Парады дзелавой дапамогі кіраўніку палітшколы, прапагандысту, завочніку ці дакладчыку атрымаць у партгабінеце нельга.

Але ў кіруючых работнікаў райкома ёсць апраўданне:

— Не раз хадайнічалі, каб прыслалі загадчыка партгабінетам, але такога чалавека нам не даюць.

Вядома, што такія апраўданні ўсур'ёз прыняць нельга. Да восені гэтага года быў спецыяльна вызначан чалавек загадваць габінетам тав. Гудасман, але гэта было толькі штатнае месца. Партгабінет, як і цяпер, быў пад замком, а яго былы загадчык быў нязменным упаўнаважаным у сельсавеце.

Справа не ў адсутнасці адпаведнага чалавека ў крупскай парт арганізацыі для загадвання партгабінетам, а ў непадрыхтаванасці гэтай работы.

Я. ІВАШЫН.

Увазе пракуратуры рэспублікі

БЯЗДУШНЫЯ, ЗЛАЧЫННЫЯ АДНОСІНЫ ДА ЖЫВОГА ЧАЛАВЕКА

Гэтымі днямі мы змяшчалі ў «Звязде» агляд пісем калгаснікаў аб тым, як няўменне спалучаць асабістыя інтарэсы калгаснікаў з іх грамадскімі інтарэсамі, грубае адміністраванне і парушэнне прынцыпаў дэмакратыі ў калгасах з'яўляецца значным тормазам на шляху арганізацыйна - гаспадарчага ўмацавання калгасаў і ператварэння іх у большэвіцкія.

Нежэй мы змяшчаем агіднейшы факт грубага ігнаравання інтарэсаў калгаснікаў, які меў месца ў калгасе «Зара захада», Бораўскага сельсавета, Менскага раёна. У выніку бюракратычных бяздушных адносін старшыні калгаса Лістапада і хуліганскага ўчынку прапазшага ў калгас кулака Жагеля, заўчасна памёрла калгасніца Якубовіч.

Мы патрабуем ад пракуратуры рэспублікі неадкладнага расследвання гэтай справы і прыцягнення да адказнасці вінаватых у смерці Якубовіч.

***

(Пісьмо рабочага)

Мая маці, калгасніца Якубовіч з калгаса «Зара захада», Менскага раёна, працуючы на полі, захварала. Сваякі звярнуліся да старшыні калгаса Лістапада з просьбай даць каня адвезці матку ў больніцу. Лістапад назваў матку гультайкай і катэгарычна адмовіўся даць каня. Тры дні яна ляжала без усякай дапамогі. Гэта выклікала абурэнне сярод калгаснікаў, якія пачалі ляць Лістапада за яго бяздушныя адносіны да маёй маткі. Толькі пасля гэтага Лістапад загадаў «калгасніку» Жагелю адвезці ў горад гуркі і апрычасова ўзяць на воз хворую. Жагель праязджаў з гуркамі амаль цэлы дзень. Матка ўвесь час ляжала на вазу. Калі пад вечар Жагель прывёз, нарэшце, хворую ў больніцу, яе адмовіліся там прыняць. Жагель паехаў назад. Па дарозе ён пасадзіў на воз і сваю жонку.

Ад'ехаўшы поўдарогі, Жагель пачаў крычаць на маю матку, што каню цяжка везці, потым штурхнуў яе ў грудзі, скінуў з воза і пагнаў каня. З вялікімі труднасцямі хворая дабралася дадому. Праз некалькі дзён лёгкі жывую яе зноў адвезлі ў больніцу, дзе яна і памёрла.

Вінаватыя ў смерці маёй маткі дагэтуль не прыцягнуты да адказнасці. У Бораўскім сельсавеце гэту справу паклалі пад сукно.

Жагель—у мінулым кулак — меў 20 дзесяцін зямлі, трымаў батракоў. Матка мая батрачка, не раз у яго працавала.

У заключэнне прошу дадаць, што факты грубага ігнаравання інтарэсаў калгаснікаў, бяздушных адносін да іх у калгасе «Зара захада» за апошні час стаў частым з'явішчам.

ЯКУБОВІЧ.

НЯМА ДРЭННЫХ РАЁНАЎ, А ЕСЦЬ ДРЭННЫЯ КІРАЎНІКІ

Х. ДУНЕЦ

Прапойскі раён сапраўды заслужыў права радасна праводзіць работу свайго з'езда советаў. Аддалены і адарваны ад чыгункі і бліскіх прамысловых цэнтраў, не карыстаючыся ніякімі перавагамі ў параўнанні з іншымі раёнамі, Прапойскі раён адлюк ясна даказаў, што няма дрэнных ці добрых раёнаў, а ёсць дрэнныя ці добрыя кіраўнікі. І сапраўды: раней Прапойск год за годам дрэнна выконваў абавязацельствы перад дзяржавай, часта западаў на чорную дошку.

Зусім іншую карціну раён прадстаўляе к свайму VII з'езду. Прапойск займае месца на ўсебеларускай чырвонай дошцы. Па сельгаскампаніях ён ідзе сярод першых.

Цікавы і іншыя лічбы, паказваючыя ўздым гаспадаркі і культуры Прапойскага раёна паміж двума з'ездамі советаў. У 1930 годзе тут было 15 с.-г. машын, цяпер 415 (сярод іх некалькі трактароў. У Прапойску МТС няма). Ураджайнасць зерневых падняслася з 5,1 цэнтнера з га ў 1931 да 8,4 у 1934 годзе. Пры агульным падзенні ліку пагалоўя жывёлы, колькасць пялят з 1931 года падвоілася (было ў 1931 г. 1.375, цяпер 2.786), што і гаворыць аб стварэнні базы для росту пагалоўя. Бюджэт на народную асвету ў 1931 годзе складаў 310.000 руб., а ў 1934 годзе 767 тыс. руб. Рост больш, чым удвая. Расходы па мясцовому бюджэту на патрэбы народнай гаспадаркі выраслі параўнальна з 1931 годам у 2,5 разы: з 614.443 да 1.510.[illegible] руб., а па соцыяльна-культурнаму абслугоўванню насельніцтва з 8,6 руб. у сярэднім на душу насельніцтва да 20.

Значна вырасла школьная сетка ў раёне і будаўніцтва новых памяшканняў. Толькі ў адным 1934 годзе закончана будаўніцтва 6 новых тыповых школ.

Найбольш яркім паказальнікам гаспадарча-палітычнага ўздыму раёна за апошні перыяд з'яўляецца поспех па лініі калектывізацыі. У 1931 годзе ў раёне было 18,8 проц. калектывізацыі, цяпер у калгасах 83 проц. гаспадарак—91 проц. пасеўнай плошчы. У ходзе выбораў у советы ў калгасы раёна ўступіла 1.200 гаспадарак.

Але гэта—результат. Важна як дасягнуты гэтыя результаты. Па ходу з'езда советаў можна было заключыць, што асноўнае каштоўнае ў рабоце раённага кіраўніцтва гэта аператыўнасць, правільны падбор актыва, умелае выкарыстанне энтузіязму мас, цёбкасць у рабоце, песная сувязь з незавым актывам. Аб гэтым гаварыла вялікая колькасць выступаўшых па практычных пытаннях чарговых работ. Аб гэтым гаварыў таксама склад з'езда, у якім прымалі ўдзел знатныя людзі калгаснага ладу накшталт конюха Батаўкіна з калгаса «Окцябр», пазаўшага клас догляду каня, або ударніка клас догляду каня, або **Федчанка Вольгі**—сяўркі калгаса «КІМ», якая дабілася сярэдняга дзеявога выхаду ад адной сеяўнаткі 9 цэнтнераў (агульнае сярэдняе—6 цэнтнераў), або цялятніцы **Пашкевіч** з калгаса імя Чарвякова, ударніцы, сыны якой займаюць адказныя камандныя пасты ў Чырвонай армі і т. д. і т. д.

Дэлегаты з'езда паказалі сваю палітычную свядомасць і тады, калі ім было даложана аб забоўстве здраднікам аднаго з лепшых сакратароў тавариша **Сталіна**—т. **С. М. Кірава.** Пры грабавей цішыні была заслухана прамова старшыні з'езда. Адзін за другім узыходзілі калгаснікі на трыбуну. Яны абавязваліся акружыць партыю цесным кальцом прыяцеляў і памочнікаў, і ў знак адданасці партыі і глыбокай памяці аб т. Кіраве прасілі прэзідыум з'езда перадаць райкому партыі іх заявы аб уступленні ў групу спачуваючых. Пажылая Пашкевіч, на вачох у якой толькі што блішчэлі слёзы, пявода ўзышла на трыбуну і спакойна, урачыста, заявіла аб сваіх абавязках служыць радзіме і выкарэніць гадаў-кулакоў. Затым гаварыў б. чырвоны партызан, які прысягаў пролетарскай прысягай аддаць апошнія свае сілы справе партыі.

Так з'езд Прапойшчыны паказаў свой палітычны твар. І гэта дало адчуць, што соцыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі зайшла глыбока, што яна закранула найглыбейшыя звілны свядомасці прапоўных, што яна ўстаджаствавала ў вёсцы. Але к нядарма дэлегаты з'ездаў падкрэслівалі задачы класавай пільнасці. Рад фактаў у часе выбарчай кампаніі выявілі наяўнасць актывізацыі класавага ворага.

Чырвонапольскі раённы з'езд советаў прайшоў пад знакам мабілізацыі прапоўных мас па завяршэнне сельскагаспадарчай кампаніі. Чырвонаполле не можа хваліцца поўным выкананнем гаспадарча-палітычных задач. Асабліва адчувальны прарыў на ільну: к адкрыццю з'езда было выканана толькі 70 проц. задання. Не закончаны хлебазакупкі (88 проц.) і хлебапастаўкі (93 проц.), фінансы на 80 проц. Усё-ж увогуле раён за апошні перыяд сягнуў уперад. Выбары прайшлі пры ўдзеле 82 проц. выбаршчыкаў і пры такім-жа процанце ўдзельнікаў-жанчын.

Раён ганарыцца тым, што мае сярод 16 старшынь новавыбраных сельсоветаў двух старшынь-жанчын. За апошні перыяд зроблен рашучы пералом у галіне калектывізацыі. Усё гэта дало з'езду падставу лічыць правільнай лінію РВК ў галіне соцыялістычнага будаўніцтва. Але з'езд працаваў пры свядомасці незадаволенасці дасягнутымі поспехамі. Гэты адзначатак трывогі і высокай патрабаўнасці да сябе праявіўся таксама ў тым, што з'езд імкнуўся ўпучыльніць сваю работу і хутчэй кінуць усю жывую сілу на ліквідацыю прабелаў.

Было шмат цікавых і дзелавых выступленняў на з'ездзе советаў Чырвонаполля. Асабліва маляўнічымі былі выступленні двух дэлегатак-калгасніц. Яны, гэтыя калгаснікі, гаварылі ў «гістарычным разрэзе», расказваючы з'езду, «чым мы былі і чым сталі».

Вось расказ дэлегата, калгасніка Новікова аб тым, як у працэсе класавай барацьбы нарадзіўся і ўмацаваўся калгасны лад. «Вёска Жаліжа—расказвае ён—была крэпасцю кулакоў». Яшчэ ў 1931 г. кулакі чым прабавалі «змяніць уладу». Калі ў 1931 г. арганізаваўся калгас, супроць калгаснікаў пусцілі ў ход палкі, ім не давалі прайсці вуліцу. У калгасе былі 4 гаспадаркі, не было чым сеяць. Дзяржава дапамагла. Цяпер калгас жыве па шырокую нагу. Калгаснік на працадзень атрымаў 2,5 кілограма зернавых і 7 кг. бульбы. Пабудавалі канюшню.

У гэтых выступленнях адлюстраваны прамоці нашай партыі ў барацьбе за калгасны лад, за заможнасць калгаснікаў.

Разам з гэтымі дасягненнямі дэлегаты з'езда Чырвонаполля давялі вострыя ўскрывалі прычыны прабелаў і прарываў у раёне. Дэлегаты амалі ўляць «быка за рогі», яны падкрэслілі слабую пераробку совецкага апарата, недастатковую работу з актывам, элементы гаслерства і кампанейшчыны, зусім слабую масавую работу. Аб раёнае работнікаў раённага совецкага апарата было сказана ў вельмі пахвальных тонах. Зусім правільна было ўказана, што інструктар РВК павінен стаць значнай фігурай совецкага актыва, «штурхачом» практычнай справы.

На з'ездах, на жаль, з дакладаў выпалі пытанні культуры і добрыбыту. Гэтым пытанням аддавалася ўвага толькі ў спрэчках. Выступаўшыя настаўнікі, ветурачы, работнікі больніц падкрэслівалі, што тут не пачаты край работы. Не заўсёды той ці іншы работнік апавята ўсю мае значэнне культурнай рэвалюцыі, праўляе правільны падыход да калгаў совецкай інтэлігенцыі.

Комунальнае будаўніцтва і бытавое абслугоўванне ў гэтых раёнах вельмі слаба пасоўваецца ўперад. Нават у раённых цэнтрах няма прыжэтных пераменк.

Аб забароне самачыннага павышэння заработнай платы рабочым і служачым

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР ад 12 снежня 1934 г.

У адпаведнасці з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 26/XI-1934 г. «Аб забароне самачыннага павышэння заработнай платы рабочым і служачым», Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

Прапанаваць народным камісарам, кіраўнікам цэнтральных устаноў і старшыням гарадскіх советаў і раённых выканаўчых камітэтаў устанавіць суровы нагляд за выкананнем пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 26-XI—34 г. «Аб забароне самачыннага павышэння заработнай платы рабочым і служачым», прыцягваючы вінаватых у парушэнні ўказанай пастановы да суровай адказнасці.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Нам. кіраўніка спраў Совета Народных Камісараў БССР І. ПЯТРОВІЧ.

Аб папулярызацыі XV гадавіны вызвалення Украіны ад белагвардзейцаў

Пастанова бюро Менгаркома КП(б)Б ад 14-XII-1934 г.

Бюро ГК КП(б)Б адзначае выключнае палітычнае значэнне папулярызацыі сярод працоўных, асабліва працоўнай моладзі, XV гадавіны вызвалення Украіны ад белагвардзейскіх армій Дзенікіна, як перамогу стратэгіі Леніна-Сталіна, як перамогу «сапраўды моцнага саюза рабочых і сялян розных нацый у барацьбе за совецкую ўладу, за знішчэнне гнёту памешчыкаў і капіталістаў, за сусветную федэратыўную Совецкую Рэспубліку» (ЛЕНІН).

У сувязі з гэтым бюро ГК ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прапанаваць усім парткомам і парторгам арганізаваць у часе абедзеных перапынкаў чытку матэрыялаў аб баях пад Варонежам, Касторнай, Харкавам і інш. стратэгічных пунктах.

2. Арганізаваць спецыяльныя вечары ўспамінаў па клубах з выступленнямі былых удзельнікаў Чырвонай арміі, дзейнічаўшай супроць Дзенікіна і Врангеля.

3. У партпалітсетцы прысвяціць адну гадзіну чарговых заняткаў азнаямленню слухачоў з ролай тав. Сталіна ў барацьбе за ачышчэнне Украіны ад белагвардзейскіх армій.

4. 18-га снежня арганізаваць у Доме партактыва вечар, прысвечаны XV гадавіне вызвалення Украіны ад белагвардзейцаў з выступленнямі ўдзельнікаў грамадзянскай вайны, дзейнічаўшых супроць Дзенікіна на Украіне.

Запрасіць на гэты вечар спецыяльную дэлегацыю ад працоўных Харкава і Варонежа.

5. Арганізаваць спецыяльныя экскурсіі школьнікаў і рабочай моладзі ў Музей рэволюцыі з спецыяльным паказам матарыялаў аб 1919 годзе на Украіне.

6. Бендзяржкіно арганізаваць у рабочых клубах з 15-га па 20-е снежня паказ спецыяльных кінофільмаў з эпохі грамадзянскай вайны на Украіне.

7. Дому партактыва і дзяржаўнай бібліятэцы ў двухдзённы тэрмін распрацаваць і апублікаваць у друку спіс рэкамендуемай мастацкай і гістарычнай літаратуры з дапейшай арганізацыяй калектыўнай чыткі яе на прадпрыемствах, у клубах і на кватэрах.

Сакратар Менгаркома КП(б)Б РЫСКІН.

РАСТУЦЬ МАСТАЦКІЯ КАДРЫ

Адкрыты дзіцячы раніпнік. Даны музычнай школай у зале Беларускай Дзяржаўнай кансерваторыі, паказаў, што гэта дзецішча Окцябра за апошні час значна вырасла і ўмацавалася.

На сёнешні дзень у сценах музычнай школы навучаецца 650 дзяцей, з якіх 65 проц. дзеці рабочых. Школа мае моцны педагагічны калектыў, у склад якога ўваходзяць высока-кваліфікаваныя педагогі.

Вучоба вядзецца ў строга плановым парадку па выразна выпрацаванай і ўдакладнёнай праграме, разлічанай на 7 год навучання. Пры школе ёсць група адароных дзяцей (Ладыгіна, Марозава — клас Віз'ена, Вайншток — клас Фідлона і інш.), атрымліваючых стыпендыю.

У гэтым годзе адкрыт клас народных інструментаў, кіраўніком якога запрошан тав. **Зорын.** Значна павялічана колькасць інструментаў, з якіх 175 скрыпак і 17 віяланчэлей замест 1 скрыпкі, складаўшай у 1931 г. увесь скрыпічны інвентар музшколы. Паралельна вучобе музшкола праводзіць вялікую грамадскую работу, перыядычна наладжваючы канцэрты ў школах, раніпніках, перадачы па радыё і т. д.

Музычная школа таксама ў зяла на сябе ініцыятыву па ліквідацыі музычнай няграматнасці сярод бацькоў вучняў.

Памяшканне школы зусім не адпавядае растучым запатрабаванням. Напрыклад, з паданых 1500 заяў у гэтым годзе прынята было 200 чалавек, астатнія ж асталіся за бартом. Апрача таго з-за недастатковай колькасці раяляў у вучняў на даму прышлося ўвесці ў практыку прымацаванне дзяцей, не маючых інструмента, што таксама ўносіць пэўныя перабоі ў паспяховасці вучобы. Ясна, што ўсё гэта труднасці росту, якія можна будзе зжыць пры дапамозе партыйных і грамадскіх арганізацый, Наркомасветы і галоўным чынам Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі і музтэхнікума, якія да гэтага часу не аказвалі належнай увагі музычнай школе.

Улічваючы важную ролю, якую адыгрывае музычная школа ў справе выхавання мастацкіх кадраў, трэба дабіцца, каб гэтаму сур'ёзнаму рассаднику музычных ведаў была аказана патрэбная дапамога.

С. Б.

Па Совецкай Беларусі

МЕТАЛААПРАЦОЎЧАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ БССР НА ВЫСТАЎЦЫ ВАРШТАТАБУДАЎНІЦТВА

Белметалатрэст рыхтуецца да ўдзелу ў выстаўцы варштата-будаўніцтва, якая арганізуецца к VII з'езду советаў у Маскве. На выстаўцы будзе прадстаўлена каля 15 варштатаў заводаў імя Варашылава, імя Кірава (былы «Комунар») — Менск, «Чырвоны металіст» (Віцебск), «Пролетарый» (Гомель). Экспанаты будуць дэманстравацца ў рабочым стане.

ЖАНЧЫНЫ — КАМАНДЗІРЫ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

У мясцовай прамысловасці БССР працуюць 5 ЖАНЧЫН-ДЫРЭКТАРОЎ і нам. дырэктароў заводаў і фабрык.

Апрача таго ў ЯКАСЦІ НАЧАЛЬНІКАЎ ЦЭХАЎ І ІХ НАМЕСНІКАЎ ПРАЦУЕ 19 ЖАНЧЫН, МАЙСТРАМІ ЦЭХАЎ І ІХ НАМЕСНІКАМІ — 20, 23 ЖАНЧЫНЫ ЗАЙМАЮЦЬ ПАСАДЫ ЗАГАДЧЫКАЎ І МАЙСТРОЎ ЗМЕН, 32 — ІНЖЫНЕРНА-ТЭХНІЧНЫЯ І 29 НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ.

Г.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА АРХІТЭКТАРАЎ

20 снежня ў Доме пісьменнікаў адкрыецца першая ўсебеларуская нарада совецкіх архітэктараў. У парадку дня — інфармацыя аб выніках усесаюзнай архітэктурнай нарады і аб падрыхтоўцы да ўсесаюзнага з'езда совецкіх архітэктараў.

ВЫТВОРЧАСЦЬ МУЗЫЧНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

У Магілеве арганізавана арцель па вырабу музычных інструментаў. У 1935 годзе арцель выпусціць балалаек, гітар, мандалін, гармонікаў і інш. інструментаў на 100.000 руб.

ТРУБАЛІЦЕЙНЫ ЗАВОД Ў МАГІЛЕВЕ

СНК БССР зацвердзіў пралетаўлены наркаматам мясцовай прамысловасці генеральны план будаўніцтва Магілеўскага трубаліцейнага завода. Завод будзе выпускаць 10.000 тон чыгунных труб у год. Давядзенне яго магутнасці ў далейшым да 14.000 тон. Агульны кошт будаўніцтва — 4.747 тыс. рублёў.

ХЛЕБНЫЯ КРАМЫ Ў ЛЕСПРАМГАСАХ

У леспрамгасах Беларусі адкрываюцца 63 новыя хлебныя крамы. На іх абсталяванне асігнавана 125.000 руб. З 1-га студзеня ў леспрамгасах і на іх участках будуць працаваць звыш 400 пунктаў па продажу хлеба лясным рабочым. Арганізуецца таксама продаж хлеба ў сталовых і буфетах.

ГАСТРОЛЬНАЯ ПАЕЗДКА ТЭАТРА ОПЕРЫ І БАЛЕТА

З 1 студзеня Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета выязджае ў гастрольную паездку ў Віцебск, Гомель, Бабруйск і Магілеў. У гэтых гарадах тэатр будзе працаваць да 1 чэрвеня і дасць 120 спектакляў.

Тэатр пакажа оперы «Цікавая дама», «Князь Ігар», «Севільскі цырульнік» і балет «Чырвоны мак».

Фота-эцюд КАПЛІНСКАГА.



У садзе «Профінтэрн» (былы «трэк») адкрыўся новы каток мясцовага фігурнага катання, а таксама абсталёван дзіцячы каток і лыжная база. Каток забяспечан канькамі і бацінкамі ў дастатковай колькасці.

На катку таксама пабудавана зала для танцаў.

НА ЗДЫМКУ: заліўка катка.

ШАХМАТНЫ ТУРНІР-ЧЭМПІЯНАТ СССР

ЛЕНІНГРАД.

V ТУР

Выйгралі: Левенфіш у Савіцкага, Юдовіч у Фрэймана, Румін у Мазеля і Белавенец у Верасава. Закончылі ў нічыю: Рабіновіч — Чэхавер, Лісіцын — Раўзер і Кан — Панаў. Партыі не закончаны: Алатарцаў — Дубінін, Багатырчук — Ільін-Жэнеўскі і Рагозін-Макагонаў.

VI ТУР.

Выйгралі: Верасаў у Савіцкага, Рагозін у Ільіна-Жэнеўскага, Кан у Фрэймана, Юдовіч у Раўзера, Дубінін у Лісіцына і Чахавер у Алатарцава. Нічые: Румін — Белавенец і Панаў — Багатырчук. Партыі нясканчаны: Макагонаў — Мазель і Левенфіш—Рабіновіч.

Даіграванне адкладзеных партый дало наступныя вынікі: выйгралі Раўзер у Чэхавера, Левенфіш у Фрэймана, Мазель у Савіцкага, Белавенец у Рагозіна, Алатарцаў у Панава, Дубінін у Чэхавера, Алатарцаў у Фрэймана, Лісіцын у Панава, Багатырчук у Румына, Верасаў у Рагозіна, Дубінін у Рабіновіча, Багатырчук у Ільіна-Жэнеўскага, Рагозін у Макагонава і Макагонаў у Мазеля. Сыгралі ўнічыю: Багатырчук—Белавенец, Фрэйман —Рабіновіч, Раўзер — Левенфіш, Фрэйман—Лісіцын і Алатарцаў — Дубінін. Недаіграна партыя Левенфіш—Рабіновіч.

СТАНОВІШЧА ПАСЛЯ 6-ГА ТУРА

Алатарцаў — плюс 4,5; Багатырчук, Белавенец і Кан па плюс 4; Левенфіш — плюс 3,5 з 5-ці; Дубінін, Рагозін і Юдовіч — па плюс 3,5; Мазель, Макагонаў і Чэхавер— па плюс 3; Рабіновіч — плюс 2,5 з 5-ці; Лісіцын, Румін, Ільін-Жэнеўскі і Раўзер — па плюс 2,5; Верасаў, Панаў, Савіцкі — па плюс 2 і Фрэйман плюс 1.

АДКРЫЦЦЕ ШАХМАТНА-ШАШАЧНАГА КЛУБА

Учора ў памяшканні клуба імя Сталіна адбылося ўрачыстае адкрыццё першага ў БССР шахматна-шашачнага клуба.

КУЛЬТУРА УКАРАНЯЕЦЦА У КАЛГАСНЫ БЫТ

МСЦІСЛАЎЛЬ. (Ад карэспандэнта «Звязды»). 16 брыгад калгаса імя Чарвякова звязаны з праўленнем тэлефонамі.

У калгасе ёсць свой радыёвузел. У хатах калгаснікаў—рэпрадуктары і навушнікі. Калгас электрыфікаваны: дынамо дае электрычнае святло ў хаты калгаснікаў.

Добра абсталёван клуб — цэнтр культурна - палітычнага жыцця калгаса.

Апрача калгаснага клуба, у кожнай з брыгад ёсць памяшканні, дзе праводзіцца масавая работа з калгаснікамі.

У калгасе працуе свая сталовая.

АНЭТ.

Гандлёвая хроніка

Ужо закончана будаўніцтва і абсталяванне менскага дзіцячага універмага, які адкрываецца 1 студзеня 1935 года па Ленінскай вуліцы.

Магазін будзе мець наступныя аддзяленні: гатовай вопраткі, трыкатажнае, абутковае, спартыўнае, папяровае і аддзел цацак. План тавараабароту універмага — 600 тысяч руб. у квартал.

Пры дзіцячым універмагу заканчваецца абсталяванне першай у БССР дзіцячай цырульні.

* * *

Беларускае аб'яднанне культтавараў Белкаапсаюза ў бліжэйшы час адкрывае новыя магазіны па продажу культтавараў у Старых Дарогах, Расонах і Лоеве. Да 1 лютага 1935 года ў Полацку, Ветцы і Любані будуць адкрыты ўзорныя культмагі.

Да 15 студзеня будзе закончана пашырэнне менскага ўзорнага магазіна культтавараў. Будуць адкрыты новыя аддзелы—канцылярскіх прылад, паляўнічых тавараў і спартінвентару.

НОВЫЯ КНІГІ

Акад. Н. М. Кулагін. Агратэхнічныя мерапрыемствы, як сродак барацьбы са шкоднікамі для паляводства нашай краіны. Выд. БелАН, 1934 г., стар. 31, ц. 75 кап., тыраж 2.000 экз.

У брашуры выкладаюцца асноўныя агратэхнічныя мерапрыемствы па барацьбе са шкоднікамі паляводства. У ёй акад. Кулагін у эразумелай, папулярнай форме на радзе практычных прыкладаў паказвае на вялікае значэнне рашучай барацьбы са шкоднікамі ў справе ўздыму ўраджаю. Падаючы адзін са спосабаў барацьбы са шкоднікамі:— агратэхнічны спосаб, аўтар з усёй рашучасцю падкрэслівае, што агратэхнічныя мерапрыемствы, хімічныя і механічныя спосабы барацьбы складаюць адзіную сістэму мерапрыемстваў і процістаўляць гэтыя метады адзін другому ні ў якім разе нельга.

У брашуры на радзе прыкладаў паказваецца на вялікае значэнне ранніх тэрмінаў сяўбы яравых культур, на правядзенне абавязковага лушчэння з наступным глыбокім зяблевым ворывам, барацьбе з пустазеллем, вачыстка насення і т. д.

Брашура разлічана на сярэдняе звяно аграномаў і калгасных актыў.

Праф. М. Дарожкін.

ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ

у комуністычны інстытут журналістыкі БССР на 1935 г.

Комуністычны інстытут журналістыкі БССР з'яўляецца вышэйшай партыйнай навучальнай установай, якая рыхтуе адказных рэдактароў раённых і палітаддзельскіх газет і работнікаў сярэдняга звяна цэнтральных газет.

КІЖ праводзіць набор на:

1. Асноўны сектар (тэрмін навучання — тры гады: падача заяў да 10 ліпеня 1935 г., пачатак заняткаў з 1 верасня).

2. На падрыхтоўчы курсы для паступлення на асноўны сектар (6-месячны курс навучання) падача заяў да 20 снежня 1934 г.; пачатак заняткаў з 1 лютага 1935 г.

3. Комсамольскае аддзяленне (тэрмін навучання — два гады; падача заяў да 10 ліпеня 1935 г., пачатак заняткаў з 1 верасня).

ПАСТУПАЮЧЫЯ НА АСНОЎНЫ СЕКТАР

павінны адпавядаць наступным патрабаванням:

а) двухгадовы партстаж без замены стажам ЛКСМ;

б) не менш трохгадовага стажу работы ў прамысловых прадпрыемствах, МТС, соўтасе, калгасе;

в) вопыт партыйна-масавай і грамадскай работы і ўдзел у той ці іншай форме ў большэвіцкім друку (рабкор, селькор, ваенкор, работніцкія газеты);

г) узрост ад 22 да 32 год.

Паступаючыя на асноўны сектар павінны па гісторыі партыі, палітэканоміі і эканомпалітыцы мець веды ў аб'ёме двухгадовай СПШ; па агульнаасветных дысцыплінах: мове, матэматыцы і т. д. — у аб'ёме рабфака.

ПАСТУПАЮЧЫЯ НА ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ

павінны адпавядаць патрабаванням, пералічаным у пунктах «а», «б», «в», «г» для паступаючых на асноўны сектар.

Паступаючыя на падрыхтоўчыя курсы павінны па гісторыі партыі, палітэканоміі і эканомпалітыцы мець веды ў аб'ёме двухгадовай СПШ, па агульнаасветных дысцыплінах, мове матэматыцы і т. д. — у аб'ёме нясканчанага курса рабфака, або тэхнікума, 7-годкі.

Паступаючыя на асноўны сектар і шасцімесячныя падрыхтоўчыя курсы павінны прадставіць у КІЖ:

а) анкету, зацверджаную ГК, РК КП(б)Б, палітаддзелам;

б) кароткую біяграфію;

в) характарыстыку ад парткома;

г) даведку ўрача аб годнасці да навучання і магчымасці пражываць у інтэрнаце;

д) распіску камандзіруемага аб тым, што яму вядомы правілы прыёму;

е) да ўсіх вышэйпералічаных дакументаў павінна быць прыкладзена камандзіроўка (пастанова) ГК, РК КП(б)Б, палітаддзела.

КОМСАМОЛЬСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

рыхтуе адказных работнікаў комсамольскіх старонак райгазет, адказных сакратароў і загадчыкаў аддзеламі раённых і цэнтральных (комсамольскіх) газет і іншых работнікаў палітаддзельскіх газет.

На комсамольскае аддзяленне прымаюцца комсамольцы, — члены і кандыдаты партыі, якія адпавядаюць наступным патрабаванням:

а) трохгадовы комсамольскі стаж;

б) не менш трохгадовага стажу работы ў прамысловых прадпрыемствах, МТС, соўтасе, калгасе;

в) вопыт комсамольскай і грамадскай работы і ўдзел у нізавым друку (рэдактар, член рэдкалегіі насценгазеты, рабкор, селькор);

г) узрост ад 19 да 23 год.

Комсамольцы не члены і не кандыдаты партыі, адпавядаючыя ўмовам, пералічаным у параграфах «а», «б», «в», «г», «д» могуць паступіць на комсамольскае аддзяленне толькі па камандзіроўках ЦК ЛКСМБ;

д) паступаючыя на комсамольскае аддзяленне павінны мець падрыхтоўку ў аб'ёме рабфака;

е) паступаючыя павінны прадставіць у КІЖ: анкету, зацверджаную ГК, РК ЛКСМБ, палітаддзелам, кароткую біяграфію; характарыстыку комсамольскай арганізацыі; даведку ўрача аб годнасці да навучання і магчымасці пражываць у інтэрнаце; распіску паступаючага аб тым, што яму вядомы правілы прыёму;

ж) да ўсіх вышэйпералічаных дакументаў павінна быць прыкладзена камандзіроўка (пастанова) ГК, РК ЛКСМБ.

Усе заявы з указанымі дакументамі павінны быць пасланы ў мандатную камісію КІЖ (Менск, Чырвонаармейская 8, КІЖ БССР);

Для ўсіх дапушчаных мандатнай камісіяй у КІЖ праводзяцца іспыты па мовах (беларускай і рускай), матэматыцы, геаграфіі і бягучай палітыцы.

У КІЖ'ы студэнты ўсіх аддзяленняў, у тым ліку комсамольскага і шасцімесячных курсаў забяспечваюцца стыпендыяй у памеры 150 руб., інтэрнатам, харчаваннем, падручнікамі і пісьмовым прыладамі.

Кватэрамі сем'і студэнтаў не забяспечваюцца.

Камандзіруючыя арганізацыі павінны:

а) забяспечыць камандзіруемага неабходнымі сродкамі (аплата дарожных выдаткаў у абодва канцы);

б) прадставіць камандзіруемым для падрыхтоўкі да іспытаў паўтарамесячны водпуск з захаваннем зарплаты (памімо чарговага водпуску).

ПАДСТАВА: пастанова Наркомпраца СССР ад 17 снежня 1930 г., апублікаваная ў «Известиях» Наркомтруда» № 26-27, ст. 580.

в) Садзейнічаць камандзіруемым у падрыхтоўцы да іспытаў (разгрузка, падручнікі, кансультацыі);

г) захаваць за сям'ёй камандзіруемага кватэру, размеркаваньне і нормы снабжэння, якімі яна карысталася раней да паніка вучобы студэнта.

Паступаючыя ў КІЖ пры выкліку ў Менск павінны абавязкова мець з сабой: бялізну, абутак, верхнюю вопратку, пасцельныя прылады, учотна-партыйную (комсамольскую) картку, учотна-вайсковы білет, або іншыя дакументы аб адносінах да вайсковай службы.

Адказнасць за правільны адбор кандыдатур, у адпаведнасці з правіламі прыёму, і за своечасовае выкананне разверстак і дасылку дакументаў у КІЖ ускладаецца на ГК, РК КП(б)Б і ЛКСМБ.

Для прыёму на 1935 навучальны год вызначаецца наступная разверстка для партыйных і комсамольскіх арганізацый:

НАЗВА АРГАНІЗАЦЫІ	На асноўны сектар	На падрыхт. курсы.	На аддзел. КСМ
Менск	15	15	10
Пуікр БВ	3	7	5
Палітсектар НК БССР	4	5	5
Гомель	10	12	5
Віцебск	10	10	5
Магілеў	6	5	4
Бабруйск	3	4	3
Орша	3	3	2
Барысаў	4	3	3
Полацк	2	2	2
Мазыр	1	2	2
Рэчыца	1	2	2
Жлобін	1	2	2
Астатнія раёны БССР камандзіруюць у КІЖ па	1	2	1

Заг. аддзелам Культуры і Прапаганды Ленінізма ЦК КП(б)Б **КОНІН.**

Сакратар ЦК ЛКСМБ **АЎГУСТАЙЦІС.**

Дырэктар КІЖ'а БССР **Н. ЧЫЖОВА.**

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.

ТАБЛІЦА

з тыража выйгрышаў павыкі ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ (выпуск першага года) (беспройгрышны выпуск).

Тыраж праводзіўся ў г. КУТАІСЕ 1 і 2 снежня 1934 г.

№№ серый.	№№ аблігацый.	Сума выйгрышу.	№№ серый.	№№ аблігацый.	Сума выйгрышу.	№№ серый.	№№ аблігацый.	Сума выйгрышу.	№№ серый.	№№ аблігацый.	Сума выйгрышу.
00080	48*)	500	10717	50*)	500	08615	14*)	500	16135	89*)	1000
00178	21*)	500	10732	18*)	500	08959	30*)	500	16246	49*)	1000
00482	21*)	1000	10908	25*)	8000	06030	07*)	500	16435	07*)	500
00519	35*)	1000	11049	35*)	500	06201	45*)	1000	16493	48*)	500
00823	33*)	500	11134	22*)	500	06373	05*)	1000	16652	25*)	500
00947	42*)	500	11159	24*)	500	06583	24*)	500	16749	28*)	500
00962	26*)	500	11214	07*)	500	06814	31*)	8000	16752	01*)	500
01147	07*)	500	11472	08*)	1000	06923	1—50	250	16764	40*)	1000
01217	05*)	500	11524	49*)	1000	07074	33*)	1000	16810	23*)	500
01272	04*)	500	11533	34*)	500	07150	30*)	500	17026	46*)	500
01611	21*)	500	11643	14*)	1000	07200	22*)	500	17104	30*)	500
01643	15*)	1000	11885	42*)	500	07428	30*)	500	17215	23*)	1000
01698	1—50	250	11697	16*)	1000	07560	05*)	1000	17251	37*)	500
01891	05*)	500	12232	18*)	1000	07640	19*)	500	17299	13*)	500
01921	03*)	500	12254	29*)	500	07694	03*)	500	17316	28*)	500
02104	18*)	500	12109	48*)	500	07885	1—50	250	17406	38*)	500
02285	21*)	500	12663	25*)	500	07906	45*)	500	17550	1—50	250
02530	40*)	500	12969	29*)	500	08309	16*)	500	17558	20*)	500
03059	21*)	500	13071	1—50	250	08242	15*)	500	17877	32*)	1000
03266	1—50	250	13078	15*)	500	08425	36*)	500	18028	02*)	500
03328	08*)	500	13106	26*)	500	08484	22*)	1000	18240	10*)	1000
03337	02*)	500	13653	02*)	500	08679	13*)	500	18332	05*)	1000
03496	25*)	500	13709	28*)	500	09112	12*)	1000	18356	18*)	500
03632	06*)	1000	13763	05*)	500	09464	42*)	500	18552	07*)	500
03744	30*)	1000	14073	29*)	500	09467	05*)	500	18170	1—50	250
03746	15*)	500	14375	23*)	500	09482	27*)	500	18618	42*)	500
03854	49*)	1000	14442	1—50	250	09538	50*)	500	18666	1—50	250
04085	17*)	1000	14550	10*)	1000	09567	41*)	500	18795	32*)	500
04105	45*)	500	14615	1—50	250	09628	16*)	500	18916	1—50	250
03262	35*)	500	14647	18*)	500	09671	25*)	500	18956	35*)	500
04552	1—50	250	14914	26*)	500	09874	30*)	1000	19159	01*)	1000
04665	30*)	500	14980	50*)	500	10134	40*)	500	19251	07*)	500
04721	26*)	500	15134	10*)	500	10139	36*)	500	19351	46*)	500
04774	1—50	250	15154	05*)	500	10146	04*)	500	19650	37*)	500
04786	15*)	500	15236	07*)	500	10360	36*)	1000	19572	01*)	1000
04908	09*)	1000	15420	44*)	500	10367	01*)	1000	19635	29*)	1000
04971	37*)	500	15457	27*)	1000	10463	46*)	1000	19969	16*)	1000
05040	45*)	1000	15533	29*)	500						
05150	49*)	500	15727	04*)	1000						
05223	49*)	8000	15917	20*)	1000						
05488	39*)	500	16129	16*)	1000						

*) Астатнія 49 аблігацый гэтых серый выйгралі па 250 руб. кожная

КІРАЎНІЦТВА АПЧАЛКАСАМІ І ДЗЯРЖКРЭДЫТ БССР.

Памяшк. БДТ—1 Беларускі тэатр Оперы і Балета
Тэл. 24905
Мастацкі кіраўнік І. А. ГІТГАРЦ

17 і 18 снежня
для ударнікаў значкістаў ЗОТ і
ПІКАВАЯ ДАМА
Пачатак у 8 гадз. вечара.
Заставшіеся білеты ў касе тэатра з 12—2 і з 5—8 гадз. веч.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" | Вялікая совецкая камедыя ФЛАГ СТАДЫЁНА

Гукавы кіно-тэатр „Пролетарый" | Гукавы мастацкі фільм Чатыры візіты САМУЭЛЯ ВУЙЬЕ

Кіно „Інтернацыянал" | Новая весёлая камедыя ПРЫЖОК

Кіно „СПАРТАК" Ад 16 снежня найлепшы фільм
ЗА ШТО ЯЕ СУДЗІЛІ
(ТАМІЛА)
драма ў 6 частках
У праграме—кіно-хроніка.
Штодзённа 4 сеансы.
Каса—з 4-х гадзін дня

Калектыў рабочых, служачых і ІТР 3-га будучастка Белкомунбудтрэста выказваюць сваё спачуванне на чальніку ўчастка тав. Шайкевічу З. І. з прычыны смерці
яго брата НАУМА.

Праўленне і супрацоўнікі ЖАКТ'а № 6 выказваюць сваё спачуванне работніку жакта т. Дунеру І. А. з прычыны смерці
яго жонкі
ДОБЫ САЛАМОНАЎНЫ.

МЫ ХАЦІМ чытаць свой окцябрэцкі ЖУРНАЛ
„ІСКРЫ ІЛЬЧА"
У журнале друкуюцца апавяданні, казкі, вершы, нарысы, забаўныя прыгоды, галаваломкі.
БАЦЬКІ, не забудзьце выпісаць для нас на 1935 год штомесячны журнал
„ІСКРЫ ІЛЬЧА"
НАСТАЎНІКІ, выпішыце для школьных бібліятэк наш журнал.
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 месяц . . — 30 кап. | На 6 месяцаў . — 1 р. 80 к.
На 3 месяцы . . — 90 кап. | На 1 год . . — 3 р. 60 к.
Падпіску здавайце на пошту і пісьманосцу.

ЗАВОЧНЫ СЕКТАР МЕНСКАГА ВЫШЭЙШАГА ПЕДІНСТЫТУТА
склікае
ў г. Менску з 1 па 14 студзеня 1935 г
8-ю ЛАБАРАТОРНА-ЗАЛІКОВУЮ СЕСІЮ,
на якую выклікаюцца студэнты 2, 3 і 4 курсаў усіх прымаў і факультэтаў.
Для афармлення дыпломных работ і кандыдацкай выклікаюцца на гэты тэрмін скончылыя заочны сектар выпуску 1933 і 1934 г. г. Студэнты 1 курсаў усіх факультэтаў на гэту сесію не выклікаюцца.
Прыезд у Менск — 1-га студзеня; заняткі—2 студзеня.
Кожнаму выкліканаму пасланa асабістая павядомленне аб явцы на сесію.
Таварышы, не атрымаўшыя павядомлення павінны запрасіць заочны сектар.
Заочны сектар ВПІ.

Кіраўніцтва цыркавымі, эстраднымі і музычнымі прадпрыемствамі пры НКАсветы БССР
„ЦЭБ"
даводзіць да ведама ўсіх зацікаўленых устаноў, арганізацый і асоб, што пастановай СНК БССР ад 16-XI—1934 г.
яму надана выключнае права
ўсіх пляцовак, клубаў, тэатраў, легніх садоў, парсаў і г. д. на тэрыторыі БССР, забараніўшы ўсім іншым арганізацыям займацца гэтай справай.
Кіраўніцтва ЦЭБ'а: Менск, клуб імя VII з'езда профсаюзаў, тэлефон 22-755.
Упаўнаважаныя—у г. г. Гомелі, Віцебску, Оршы, Бабруйску.

ЗГУБЛЕНА КРУГЛАЯ ПЯЧАТКА Беларускага тэатра мукамольнай крупяной прамысловасці „Белмукапромсаюз" лічыць несапраўднай.

НАРСУД 3 участка г. Менска абвяшчае г. анаўскае ганябаванне пяткоўскаму Юльену Язэпаву (а. 6 тав. Гара. Кало дзішч. с с.), згодна прыгавору суда ад 19—4—34 г.

ЗАВОЧНЫ СЕКТАР МЕНСКАГА ВЫШЭЙШАГА ПЕДІНСТЫТУТА
склікае
8-ю ЛАБАРАТОРНА-ЗАЛІКОВУЮ СЕСІЮ,
на якую выклікаюцца студэнты 2, 3 і 4 курсаў усіх прымаў і факультэтаў.
Для афармлення дыпломных работ і кандыдацкай выклікаюцца на гэты тэрмін скончылыя заочны сектар выпуску 1933 і 1934 г. г. Студэнты 1 курсаў усіх факультэтаў на гэту сесію не выклікаюцца.
Прыезд у Менск — 1-га студзеня; заняткі—2 студзеня.
Кожнаму выкліканаму пасланa асабістая павядомленне аб явцы на сесію.
Таварышы, не атрымаўшыя павядомлення павінны запрасіць заочны сектар.
Заочны сектар ВПІ.

Рэдакцыі Беларускай Совецкай Энцыклапедыі
патрэбны на сталую працу:
кваліфікаваныя машыністкі
там-жа закупаюцца
розныя совецкія, дарэвалюцыйныя, а таксама замежныя
ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ.
Зварочвацца па адрасу: Ленінская, 29-35, 3 паверх, пакой 25, з 12 да 2 гадзін.

Згодна пастановы ЦВК і СНК БССР ад 5 сакавіка 1931 г.,
усе ўласнікі свіней
абавязаны
здаваць скуры
усіх убіваемых і павшых ад неазаразлівых хвароб свіней, не гл дзячы на ўзрост.
Для лепшага абслугоўвання насельніцтва па здачы свіных скур райзаготкантора Саюзгаткур высылае па першаму выкліку высококваліфікаваных з'ёмшчыкоў.
Для выкліку з'ёмшчыкаў зва ачаўцеся ў Саюзгаткур (Рэволюцыйная 16-10) або па тэлеф. 22-182, 20 832.
па пярэднім, што вінаватыя ў асмоле і іншпаразіце свіных тушэй, падлягаюцца да адказнасці па 152 і 196 арт. К.
САЮЗГАТКУР.

Кіраўніцтву лясамі мясцовага значэння НКЗБ
патрэбны:
галоўбух,
лесаўпарадкавальнікі і лесаводы.
Зварачацца па адрасу: Дом урада 1 паверх, пакой 165.

ДА ўвагі калгасаў, ОТСАў і іншых гаспадарчых арганізацый
Беларуская кантора па загатоўцы плем. жывёлы
„ПЛЕМЗАГОТКАНТОРА" НКЗ СССР
даводзіць да ведама ўсіх зацікаўленых арганізацый, што яна праводзіць куплю і продаж племянной і высокапрадуктыўнай жывёлы: быкоў, кароў, маладняка буйнай рагатай жывёлы, свіней і авечак па канвенцыйных цэнах, зацверджаных Комзат СНК СССР.
Адначасова з прамой закупкай ПЗК кантрактуе племянны маладняк буйную рагатую жывёлу і свіней у калгасах, калгаснікаў, гарадскога насельніцтва і аднаасобнікаў з выдачай авансіт; званых кармоў і грашовых авансаў, Наркаматы, вайсковы-гаспадарчыя ўстановы, ОРСы, совгасы-калгасы, і інш. арганізацыі, рабочыя, бескарэўны